проза

проза

Надзя Старавойтава



...навошта мы б'ем свае душы за тое,
што ня вартае нашых пакутаў?. .

# Артаграфія бяз правілаў

***Караценькі раман-агапэ[1]***

*Ня маю сумненьняў, што каханьне*
*нараджаецца не выпадкова,*
*хоць абставіны ягонага нараджэньня*
*часта маюць выгляд выпадковасьці.*
*Але ж Божыя дары не раздаюцца*
*проста так ды абы-каму, бо іхні сэнс –*
*вялікая духовая праца, узыходжаньне,*
*бо менавіта каханьне з біялягічных асобінаў*
*мужчынскага й жаночага полу*
*робіць сапраўдных людзей,*
*здатных ня толькі працягнуць свой род,*
*але і ўзвысіцца да Любові,*
*а гэта азначае – наблізіцца да Бога.*
Рыгор Сітніца.

*Але з чаго яшчэ,*
*як ня з духу высокай трагедыі,*
*можа паўстаць воля да супраці-*
*ву*
*свайму немілажальнаму кону?*
Валянцін Акудовіч.

***I***

Сівы хаос зьнявечанае раніцы. Усё віруе, імкнецца, шуміць, калечыцца. Яшчэ адзін лукаваты крок да заганы, нязґрабнасьці, недалужнасьці. Яшчэ адзін слотны штрых зьялчэлае няґеґ-

ласьці. Яшчэ адзін пранізьлівы гук зьбянтэжанага бязладдзя. Смараґдавае лісьце пачынае спадаць улетку. Кружляе ў колавароце зьнелюбелага й застыглага часу. Уздымаецца й дрыжыць па-над зямлёю, зьбіраючыся ў каралі, – жывасрэбныя паўрозы з падвешанай на іх чалавечнасьцю. Пакідаючы цябе назаўжды, яна тужліва выводзіць разьвітальнае літаньне тваёй шуплай самоце. У выратавальным памкненьні ты прагна цягнеш туды свае стамлёныя рукі, каб ухапіць яшчэ бранзалетаў з ладану, што ачысьцяць, угрэюць, натоляць азызлую сутву душы. Але табе на куксы, нібы ўжыгнаны копша, зьлятае толькі сыржавелы гадзіньнік, накрутак якога ўсё ніяк не сканчаецца. На досьвітку табе сутужна сьняцца скурчаныя, аголеныя, прасоленыя ў вільготных жоўтых разорах людзі – тыя, што не дацягнуліся, адпусьцілі нешта важнае ў сваім жыцьці...

Боль… Яна ачуняла ад болю. Вусьцішны боль перасмыкаў усё цела, што стагнала кожненькай сваёю каморачкай, як птушанё з перабітымі крыламі. Шыя, плечы, крыж, сьцёгны, улоньне, каленкі – іх выцінаў енк абразы й жаху. Ёй падалося – выпетранай была настолькі, што нават пустэча ўнутры яе ванітавала сама сабою. Ад крыку апухла горла, ад сьлёз – вочы. Цяжар ягонага цела душыў. Ён так і застаўся ў ёй. Каханы муж. Любы...

Зусім ня ґвалту чакала Ульляна шэсьць доўгіх самотных гадоў. Ад каго хоця магла б уявіць што хоця – толькі не ад яго! Таго, каго так кахала й хто калісь так кахаў яе, каго так пялегавала ў душы, кім трызьніла наяве ды ў сьне, у чыю сьмерць так заўзята, насуперак усім лагічным вытлумачэньням ня верыла, ня верыла й чакала дадому. Шэсьць доўгіх самотных гадоў яна клалася ўпрывечар спаць на абгорнутую ягонай вышыванкаю падушку: любы пах тонка й мякка спавіваў яе, нібы аксамітавы туман, прасякваючы скрозь сітавіньне ў кожную кропельку крыві, супакойваючы дзённыя турботы й сумневы, саграючы й залагоджваючы кожную частачку цела; суздром перапаўняючы сабою ўсё ейнае стварэньне, выварочваючы памяць на спод, – родны пах даваў ёй цяпло, надзею й веру, непахісную веру ў тое, што валадар ягоны жывы й абавязкова вернецца. Трэба толькі чакаць… Месяц таму ён вярнуўся, сказаў – з азербайджанскага палону. Вярнуўся чужым чалавекам. Нават вестка пра сьмерць бацькоў, як ёй падалося, не кранула яго – каменны выраз твару не парушыўся аніводнай эмоцыяй, нібыта ён загадзя ведаў пра ўсе бядоты й чакаў іх. Адылі яна ня чула больш ад мужа іншых словаў, як “адсунься”, “адкасьніся”, “адыдзіся”. Ён маўчаў. І яна не магла сьцяміць, упарта ці абыякава… Яна даглядала яго, як дзіцё: нейкім дзівам ледзь прымушала паесьці (часам браў ежу толькі з ейных клапатлівых рук ды вуснаў), калі хоць раз на дзень ёй шчасьціла крыху падсілкаваць

[1] “Агапэ – гэта любоў усеабдымная, любоў, што бяз рэшты паглынае таго, хто перажывае яе. Таму, хто спазнаў і перажыў Агапэ, нішто ў сьвеце ўжо ня важна. Яму трэба толькі любіць… Любоў Паглынальная прымушае ўсё навокал блякнуць і рабіцца нязначным… Але Агапэ – гэта нешта большае, чымся цяга альбо сімпатыя. Гэта пачуцьцё, што запаўняе цябе ўсяго да апошняе клетачкі, ператвараючы ў прах любую спробу агрэсіі… Калі мы кахаем, калі ўсімі сіламі душы верым ува штосьці, дык адчуваем сябе мацнейшымі ад сьвету, і нас ахоплівае спакой, які спараджаецца ад непахіснае ўпэўненасьці ў тым, што нішто на сьвеце ня можа адолець нашае веры” // Паўлу Каэлью. Тры формы любові – Эрас, Філас, Агапэ: http://www.warriorofthelight.com/russ/edi85_tres.shtml

яго, – ужо была радая; яна купала яго ў ваньне, быццам ён быў нерухомы (бо мог днямі пралежаць у ложку й не падняцца); яна за руку выцягвала яго з хаты на сонца, што таксама было нялёгка; ды бясконца лашчыла, лашчылася сама, але ж ён ані разу не адгукнуўся, не дакрануўся, не пацалаваў. Ён ссох на трэску, змаўклівеў, зьнерухомеў, зрабіўся чысты цень. Зрэшты, такім ён вярнуўся, але дзень пры дні яму рабілася ўсё горай… Ейны пяшчотны, каханы Адасік! Невылечны рамантык – такім памятала мужа з таго пашкольнага лета, калі пазнаёмілася з ім на вёсцы. І вось гэтая ноч.

Шугала дзікая навальніца. Такім часам, нават калі ня хочаш баяцца, усё роўна адчуваеш пэўную неаслоненасьць перад стыхіяй. Блізкасьць грымотаў са сьвігавіцаю стварае пачуваньне, быццам гэта сам Бог грозна выкляў цябе – *гром табе ў вушы й маланка ў зубы!* Малая яна не разумела гэтага выразу: чаму менавіта ў зубы? Але тае ночы, калі ён ляжаў поруч, тупа ўперыўшыся ў столь і, здавалася, нават ня згадваў пра ейную прысутнасьць, Ульляна адчула, што менавіта ад выбліскаў маланкі ёй зводзіць сківіцы. Ад пякельнага страху, ад самотнага сьлізкага адчаю ёй спляжыліся нервы: яна шаляніцаю ўскочыла на яго, пляскала па твары, крычала, плакала, маліла пагаварыць з ёю, зноў лашчылася. Ягоныя вусны – як прыемна зноў адчуваць іхні смак, ягонае цела – увайшло ў гады – блізкае... толькі ў ейных успамінах: ён маўчаў і не адказваў. Яна спынілася, горача дыхаючы, пільна паглядзела яму ў вочы. “Нібы стод каменны!” – злосьць віранулася ў ейных думках. Немаведама як, але ён прачытаў іх – пэўна, па вачох.

– Стод? Ты думаеш, я стод? – ён умэнт перагарнуў яе, апацнуўшы па шчацэ. – Чаго ты хочаш? Чаго ты лезеш? Як ты не разумееш? Стрэлы, пляшкі з палівам пад нагамі, сьмерць сяброў! Ведаеш, што адчувае чалавек, калі на ягоных вачох хтосьці расстрэльвае грузавік з людзьмі, дзе мог быць і ён сам, калі бачыш замест машыны крывавае месіва чалавек з трыццаці? – сьціснуў яе нагамі, звар’яцела трос за плечы й… біў па твары. – Ты памятаеш, мне сказалі, што бяруць у войска на месяц адно на зборы, бо ты была цяжарная, а кінулі ў Нагорны Карабах, змусілі страляць у тых, хто змагаўся за сваю свабоду! Ты памятаеш, як праглі мы гэтае свабоды для сябе, для Беларусі? Дык уяві, каб чужынец прыйшоў страляць у цябе за тое, што ты прагнеш свабоды! А мы стралялі! Гэта была ня нашая вайна, чужая вайна, але мы мусілі страляць у Свабоду! А потым – пяць гадоў ґвалту й мардабою. Ды так нам і трэба: каму быў інтэрас, што я беларус і што я спачуваю тым, каго мушу забіваць! – нянавісьць, шаленства, грэх, боль, страх вылучалі ў гэты момант ягоныя каламутна-шызыя за смугою вочы, ён захлынаўся сваімі словамі. – А аднаго я зарэзаў уласнаруч, як уцякаў! Ягоная кроў фантанавала мне ў твар, як цяпер твой подых. Я з тупасьцю садзіў у яго клінгу, а яна так гнюсна-агідна чмякала... Калі б я не забіў, мяне б забілі. І ты хочаш, каб крывавыя рукі кахалі цябе? Хочаш такога мужа? На – цалуй іх! Яны шчэ сьмярдзяць ягонымі вантробамі! Цалуй! Я не хацеў забрудзіць каханьня, але ты сьпякла мяне! Сьпякла! А-й-й! Мая галава! – ён схапіўся рукамі за скроні, біўся галавою ёй у лоб, шараваўся аб ейныя шчокі, нібы хацеў астудзіць свае. Яна аж заходзілася ад сьлёз ды крычала неўгалась: “Ня трэба!”, – але крык заглушалі грымоты, а муж ужо анічога ня цяміў.

Растрыбушыўшы яе, як жабянё, ён да крыві ўгрызаўся ў вусны, у грудзі й... ґвалціў. Ґвалціў, горай ад зьвера, ледзь не рвучы ёй цела на шматкі.

Пасьля якога разу яна ўжо цьмяна адчувала, ужо не крычала – адно ціха хлімкала. Адштурхоўваць яго больш не было моцы. Стогн, рык. Гэта было зноў ды зноў, шматкроць... Яна страціла прытомнасьць. Яна ня чула, як ён… плакаў пасьля, найпяшчотнейшымі цалункамі залізваючы кожную ейную ранку...

Цяпер ён спаў. Цяжар ягонага цела душыў. Яна ляжала, разрэзаная й раскроеная, ды толькі недашытая. І не пасьпела нянавісьць прамільгнуць у сьвядомасьці, як яе апанаваў жаль. Жаль і каханьне: ён зноў трызьніў ува сьне. Толькі цяпер яна зразумела чаму. Ён моцна сьціснуў яе, шчыльна прытуліўшыся, як бездапаможнае пераляканае дзіцянё, нешта мармытаў. Яна ўбачыла ягоныя напухлыя вочы – нібы кіпень лінуў ёй у душу, у скроні. Яна асьцярожна адсунула яго, паклала на сьпіну й лашчыла... лашчыла... У горле схлупіла ад крыўды й болю, але яна лашчыла. Лёгкім цалаваньнем анёла, ціхуткім дотыкам рукі да валасоў. Скроня да скроні – яна адчувала бой ягонае крыві. Сваёю скроняю перадавала спакой... цішу… ціш-ш-ш… і ён сьціх. Яна з цяжкасьцю зьвяла ногі рукамі й села на ложку.

У возера, хутчэй купацца. Хутка Лявоньця прывядзе малых. Яны не павінны бачыць яе такой. Божа! Як добра, што суседка забірае іх цяпер да сябе, што іх не было сёньня ў хаце…

Мілая бабця! Жыве цяпер, як адрэзаная луста. Што дачка, што ўнук – паўтара людскога, гадамі не зьяўляюцца. Апошні раз унук прыехаў, як старая перабралася жыць да Ульляны. Адась зьнік, ягоныя бацькі дачасна памерлі, неяк раптоўна – адзін за другім, Ульлянка пры надзеі – і цьвёрда вырашыла жыць на вёсцы адна й чакаць мужа. Відаць, толькі з ейнай тадышняй дзіцячай упартасьцю можна было адстаяць гэтае права ў сваіх бацькоў. Суседка Лявоньця абяцалася прыглядзець за маладзіцаю. Унук забег у хату – з мызы шаленства капае – вырашыў, што сарамаціць яго бабка, па чужых жывучы. Лаяўся, абіраў косьці, зьневажаў старую, а тады – забраў небажатку й паехаў, назаўжды. “Заўгрызьліся яны ў злосьці сваёй”, – сказала неяк Лявоньця й больш ані разу не спамянула. Але Ульляна бачыла, як узіраюцца ў гасьцінец ейныя стамлёныя выцьвілыя вочы, поўныя нейкае невыказнае скрухі. Штодня й штоночы малілася бабця, каб дараваў ёй Бог грэх вялікі: зрабіла калісьці спарон. Не хацела другога дзіцяці – ня май аніводнага. Гэтага не дараваў і муж-нябожчык: гваздаў дачку, нібы адно малая была ўсім вінаватая. Піў і гваздаў, піў і гваздаў. Не чапаў толькі яе, Лявоньцю. Рэўнасьць і помста дачкі да маці – вось што выйшла з таго дзетазабойства. Што ж, свайго глузду не прыставіш, як і любові...

Ульляна паспрабавала ўстаць і... павалілася, ногі не трымалі, жывот працяў невыносны боль, лінула кроў. “Ат, халера! Акурат як неруш! Упершыню за шэсьць гадоў”, – голаў, нібы яруха, зноў сьцепанула злосьць. Каб зноўку бярозаю не разьліцца, вырашыла не глядзець на Адася і, скурчыўшыся, пацяглася-пачыкільгала да дзьвярэй. Яна памятала тыя сьлёзы, шэсьць гадоў, амаль штодня...

На першым часе яна трымалася колькі змогі, бо такое гора нельга было выплакаць аніякімі сьлязьмі. Цяжарная ўдавіца сямнаццаці гадкоў! Гэта

быў немы, тупы боль. Першае Вуліна гора. Першае, што адкрыла сабою пас дарослага жыцьця. Яна сьцярплівілася толькі да радзінаў. Потым сьлёзы, па дзіцячай звычцы, усё ж апанавалі аблічча. Толькі бяз лямanту, бяз енкаў, бяз хліпаў. Проста ліліся па шчоках рэкі горка-салёнае вадзіцы й змахваць іх не было аніякае рахубы. Гэта ўсё адно што імкнуцца спыніць гаманкі ручай, паставіўшы ўпоперак яго даланёк – вада ўсё адно абабяжыць і паліецца прабітым шляхам. Так і сьлёзы. Яны на хвіліну прыпыняліся, калі перацiналася памяць і Ульляна адасаблялася ад свайго існаваньня, – тады вочы, як два саланцы, нерухома глядзелі ў прастору й ня бачылі яе. Адно выдавалася, што прадметы вакол, як зямная куля, шалёна круцяцца гэтым імгненьнем у дзікім карагодзе, і вочы, не пасьпяваючы дапільноўваць гэткага руху-віру, проста заміраюць на месцы: усё стракаціць і пульсуе ўваччу, гудзе ўвушшу, галава ідзе кружна… Але як толькі ясьнеў зрок і наплывалі ўспаміны – зноў ды зноў макрэлі шчокі ды шыя. Вочы патаналі ў сьлязах… Здавалася б, ну адкуль можа ўзяцца ў чалавеку такая бездань сьлёз? Часам Ульляна сама задавала сабе такое пытаньне, але адказу не знаходзілася аніколі. Насампраўдзе, яны бруіліся бясконца й няспынна, нібы з падрытых саланцоў, а тыя саланцы ўсё спраўна насычаліся немаведама з якіх разьвярэджаных зямных нетраў. Гэтыя нястомныя цурочкі, як хіжыя птушкі, неўпрыкмет пад'ядалі апошняга клёку. І толькі малыя дзеткі прымушалі Ульляну крыху варушыцца па цаліку свайго станьгомавага жыцьця.

Ульляна спакваля дабралася да свайго ўлюбёнага цар-возера ды рынулася ў асалодную адхлань. Цяпер, нават калі й зьявіцца гэтая струменная, алергічная ад'яда – сьлёзы, – яе лёгка зьліжа азёрная прошча. Пругкае скусанае цела кунежна цалавалі дробныя празрыстыя хвалі й кволыя сьвітальныя касулькі сонца. Адмыслова пахла раніца, на вызалачаных маладзіковым сонцам галінках сакаталі нейкія птушкі – яна не ўзіралася. Цяпер яна забылася на ўсё, на імгненьне перацяўшы танкое павуціньне мінуўшчыны. Цяпер яна прагла толькі гаючае пяшчоты прасьвядных хваляў ды іхнае невымоўнае асалоды. Яна не магла плысьці – хвалі самі трымалі яе, лашчачы збалелыя сьцёгны. Цяпер яна была Крулеваю гэтае пракаветнае сьвятое Вады. Даверыўшыся дабрадзейнаму выратавальнаму плёсу, яна, як русалка, гайдалася дзесь па-над ім, па-над усёй ціхутка-лагоднай роўняддзю, пужліва зазіраючы ў яе, нібы ў люстра, досьвітнай зьнічкаю... Раптам нешта боляча дзеўбанула ў плячо: гарлачык! Ульляна пачала захлынацца й тануць. Ён і тут нагадвае пра сябе – Адась Гарлачык. Зноў нясьцерпны боль працінае ўсю ейную ледзь жывую, зьнявечаную істоту. Агідны, пякучы боль. Гэты гарлачык, простая водная лілея, нагадаў ёй знаёмства, што пайшлося з кветак.

Ціхі ліпнёвы вечар, як прысак, дагараў наўкола: лагодна заходзіла барвістае сонца, што амаль замірылася са сваёю нядоўгаю сьмерцю. Ягонае праменьне павольна й пяшчотна прашывала хваёвы лес, запальваючы яго жоўта-чырвоным агнём: ажно боляча было ўваччу. Промні давалі лесу апошні шанец – скласьці рукі-галіны ў пакорлівай паставе й ціхмяна чакаць новае раніцы. Ціха й надзіва спакойна цёхкалі ў гэты вечар птушкі, ціха гралі цвыркуны, ціха гойдаліся цявінкі. І ў паветры стаяла такая ж незвычайная ціхмень, захоўваючы таямніцу мінулага дня, ягоны лёс і дзеяньні,

пяшчоту й жорсткасьць. Ульлянка ішла сабе лясною сьцяжынаю, і ёй здавалася, што ўсё навакольле віншуе яе сваёй празрыстаю цішынёю, нашэптваючы чароўнае спатканьне. Нават пах багны, што была за лесам, не пакінуў хвароблівага суму ў ейнай душы. Ён толькі поўніў сваёю нечаканасьцю дзіўную лясную цішу. Раз-пораз яна падбівала пальчыкамі галінкі дрэваў, палохаючы жамяру, закрывала далонькай сонца, гэтак шкодзячы вячэрняму хараству…

Ягоныя бацькі – Даніла й Гілена, да якіх яна хадзіла тады па малако, штовечар частавалі дзяўчыну ўшчэрць паўнюткаю конаўкай цёплага, сітаватага, духмянага сырадою, што яна раптугом выпівала з неверагоднай прасьвядаю на твары… Ульляна ўжо была зазьбіралася дадому, як хтось расчыніў дзьверы, і ў пакой заваліўся абярэмак паплаўцовае квецені. Гэта быў ён, Адась Гарлачык. У той год ён скончыў свой філфак і пасьля войска зьбіраўся настаўнічаць… Калісьці ён часьцяком хадзіў на поплаў па зёлкі, зьбіраў іх дзеля карцінаў: ён ствараў сапраўдныя шэдэўры, ён быў мастак – хлопец з небасхілам у сэрцы, з прыроджаным адчуваньнем прыгожага. Але бацька ўсё больш называў яго лугавіком, бо сын пачасту й начаваў там, у лузе... Дзядзька Данік іх і пазнаёміў: радаваўся, нібы малое, завіхаўся. Адась з усьмешкаю назіраў за такім трапяткім, кепска прыхаваным, хітраватым бацькоўскім амбарасам. Яна паціснула ягоную зялёную ад квецені руку. І ў гэтым сонечным руканьні абое адчулі разгубленасьць, прагу й саладзень адначасова. Выдавалася, праз тое аксамітавае руканьне спыніўся адвечны сусьвет.

Ягоны пакой быў сапраўдным лугам, квецень была паўсюль: сушылася на бэльках, валялася на канапе й нават ля яе, на каберчыку. І, вядома ж, – у букетах, на карцінах… Ён ужо зьлёгку наракаў на сябе, што не паслухаў зранку бацькоўскіх словаў і не прыбраў хоць крыху ўсяго гэтага, як жартавала матуля, “хлуду” і “венікаў”... Ягоны дзед і бацька былі палясоўшчыкі, ад іх і пераняў хлопец трапяткую любасьць да хараства прыроды… Пазнаёмцы апавядалі адно аднаму пра любоў – кожны пра сваю. Але, зрэшты, гэта сталася адна любоў: да кветак, сонца, неба, зораў, дажджу, зямлі, продкаў і мовы. Здавалася, іхнюю гутарку суправаджае вальс нябеснае пекнаты.

Спачатку Ульлянка фігуравалася: зьвярталася да яго на Вашэць. Ён дзівіўся з таго, як месьцічанка ладна мовіць па-беларуску. Ён дзівіўся й паважаў, бо ня думаў, што сярод пылу гарадскіх машынаў можна выхаваць настолькі тонкае адчуваньне прыроды й радзімы. Ён чуў ад яе родную гаворку і гэта акрыляла ды лучыла яго з ёю, і неадольна вабіла. Мо з таго яму так соладка схлупіла ў грудзёх пры першай размове. А мо й з таго, што яна проста была вось такая: ненадуманая, натуральная, шчырая, прыгожая. Жытнёвыя валасы амаль сягалі каленяў, а вочы – такіх ані ў кога ня бачыў: у гэткія валошкавыя віры немажліва было доўга глядзець.

Тым вечарам ён праводзіў яе дахаты. (Сёлета ейная сям’я музыкаў з Менску набыла дамок на тутэйшым хутары.) Яны мінулі бульбоўнік і трапілі на лясную сьцяжынку. У лесе была амаль ноч. Адвечная, велічная ціша ночы. Усё навакольле спала маўклівым і пяшчотным сном соннае красуні, твар якое ледзь выдаваў кунежную ўсьмешку радасьці й шчасьця, нутранога спакою й гармоніі. Го, вось жа ж ночы! Наколькі чароўнае ўражаньне выклікаюць яны ў чалавека, які гуляе па сьцішаным улоньні прыроды! У іх невычэрпная моц і энергія, нешта магічнае прыцягвае да

сябе думкі й душы людзей, якія шукаюць спакою ды раўнавагі. І варта толькі адкрыць душу гэтай містычнай цемрадзі, як адразу ж робіцца лягчэй. Незразумелае пачуцьцё радасьці й заспакаеньня наталяе цела. Яно робіцца лёгкім, што пёрка. Хочацца ляцець туды, куды кліча бязьмежнае разуменьне ночы. Хвоя, травы... Трывалы водар цямноты. І ты паддаешся й лунаеш, лунаеш, лунаеш...

– Ты толькі зірні, Адасю! Чароўная ноч, праўда? Зоркі, месяц – праз сваю прыгажосьць яны напраўду здаюцца гарачымі. А які прыемны пах хвоі! Усё такое простае, звычайнае. Мо таму й прывабнае, – з непадробнай улюбёнасьцю прамаўляла яна.

– Вось і цудоўненька, нарэшце ты сказала “ты”, – ён з захапленьнем глядзеў на яе й ня верыў, што ў адным чалавеку адначасна могуць спалучацца такая дарослая філасафічнасьць і такая дзіцячая гарэзьлівасьць.

Ульлянка пачырванела ад ягонае саркастычнае інтанацыі. Скураю адчула, як яму карціць зарагатаць.

– Не пасьміхайся з мяне! Мамця вучыць мяне паважна ставіцца да людзей, – яна натапырылася, як вожык.

– А мамця ня вучыць цябе таму, што Вашэць – гэта афіцыйны зварот? Так ты будзеш зьвяртацца да сваіх выкладчыкаў, калі паступіш на свой гістфак. А мы ж сябры.

– Уж-жо?

– А... гэта не ў сучасным, відочна, сэньсе, – схамянуўся ён. – Паводле сярэднявечнае беларускае філасофіі, усе людзі паміж сабою могуць быць сябрамі, калі толькі яны маюць штосьці агульнае. Цяперашняе сяброўства тады азначалася словам “тавар*ы*ш”. Дарэчы, менавіта з націскам на “ы”, – фігураваўся ўжо Адась.

– Чаму? – ва Ульлянцы прачнуўся гісторык.

– Таму што цяпер існуе й слова з націскам на другім складзе, яно азначае партыйны зварот, – яму страшэнна падабалася ачмураць яе філалагічным туманікам.

– Атрымліваецца, што ўсе-ўсе людзі на зямлі – сябры, бо ў іх адна зямля, адно неба й адно сонца?

– Ну, так, маўляў, усе людзі – брацьця, – зьлёгку іранізаваў. Ейная наіўнасьць так падкупляла, прыемна цешачы ягонае самалюбства.

– І ўсе беларусы – сябры, бо ў іх адна краіна й адна мова?

– Выходзіць, што так, – ён проста соладка шалеў ад такое дозы сентыментальнасьці.

– Як гэта глыбока, Адасю! Я й ня ведала. Дзякуй! – маленькая дзяўчынка проста была сама сабою, чысьцюткаю, нібы сьвятая з абразоў.

– Глыбока. Нашыя продкі былі мудрыя людзі. Цяперака цяміш, чаму беларусы ніколі не распачыналі войнаў, а толькі бараніліся?

– Яны ставіліся да сьвету як да сяброўскага?

– Магутна, праўда? Таму й герб наш нацыянальны – Пагоня – пагоня за тым, хто пакрыўдзіў, абарона. Толькі ж ці будзе ён калі дзяржаўным?

– Будзе, абавязкова будзе. Як усё так хораша павязана – дык гэта суцэльны цуд! – яна не пераставала бесклапотна пырхаць вакол яго, як матылёк, пляскаць у далоні ды неўтаймоўна радавацца немаведама чаму: ці то ягонай кампаніі, ці то таямнічасьці зорнае ночы.

– Ульціся, вось гэта табе, – Адась працягнуў ёй невялічкі букет з па-

параці, рамонкаў, дзьвюх цыбалак чырвонага маку й цявінак з валошкамі па бакох.

– Адасю! – яна ўдыхала, удыхала з асалодаю. Толькі ён бачыў яе ў гэты момант. Мілаваў вока. Як прыемна рабіць вось такім дзявочы твар! Як прыемна дарыць. Ён вычуваў цяпер радасьць, відаць, яшчэ большую, чымся яна.

– Які водар, Адасю! Калі ты пасьпеў іх назьбіраць? Як разгледзеў у такой цемрадзі?

– Звычка, – з гонарам адказаў той. – Кветкі я ўжо адрозьніваю навобмацак.

– Як гэта арыгінальна! Звычайныя красачкі, а такія пекныя. Пэўна, толькі ты так умееш.

– Напэўна, – няўцям сьцепануў плячыма.

– Так, за гэткі букет я ўсё-ўсё дарую!

– Лаўлю на слове, запомні.

Потым яны ішлі паўз балота й Адась апавядаў ёй легенду пра багну. Паводле народных аповедаў, іхняе балота ўтварылася на тым месцы, дзе плакала ў навальнічную ноч дзяўчына Гануля, зґвалчаная панам. Ейныя сінія вочы зрабіліся купінамі, на якіх да сёньня растуць сінія кветкі. Купіны тыя так і называюць – Вочы Ганулі.

Тае ночы ён узяў яе з сабою глядзець на золак... Ёй сьніўся пакой шыкоўнага гатэлю з аксаміtавымі кармінавымі шпалерамі, Адась з кветкамі, сланы, што імкнуліся яе раструшчыць... Ціха й настойліва зазьвінела шыба. Яна прачнулася. Гэта быў ён.

– Адась! Дзьве гадзіны ночы! Сумленьне ё? А напужаў як! Хіба на золак бярэцца не а чацьвертай?

– А чацьвертай, радачка-любачка, ужо сьветла! Зьбірайся хутчэй!

– Як ты можаш так рана ўстаць? – прамовіла, соладка пазяхаючы.

– А я й ня клаўся. Мяне наведала натхненьне.

Яны пайшлі да возера нацяньки. Ён моцна падтрымліваў яе за жбічак[1], пяшчотна й надзейна пераймаючы руку ды быў шалёна задаволены сваёй роляю адмысловага суправаджальніка. Гэтая дзяўчына аніколі ня бачыла, як блісьне сьвятло, як гуляе чорна-залачоным бляскам азёрны плёс уначы, аніколі ня плавала ў чоўне. Ейная шчырая рэакцыя, яшчэ зусім дзіцячая, растурбавала ўсе ягоныя залётніцкія здольнасьці. Было цікава назіраць за ёю – за чалавекам, які ўпершыню спасьцігае скарбы прыроды. Яна так выкшталцона зьдзіўлялася й радавалася ўсяму, што яе атачае й нават не атачае – толькі з прычыны таго, што яно ў гэтым сьвеце ёсьць. Само існаваньне рэчы неверагодна захапляла яе – а гэта ўласьцівае рэдкім асобам. Прынамсі, ён яшчэ ніколі не сутыкаўся з такімі людзьмі.

– Уг-г-а-а-а! Нішто сабе! – зачараваная, яна глядзела на возера. Берагі густа парасьлі аерам, да якога спускаліся, як па лесьвіцы, хвоі. Строма, што вяла да вады, і дно возера ўтваралі адну суцэльную лейку, нібы яе прадушыў капытом вялізны чорт. Такі ландшафт нечым нагадваў сібірскі: калісьці Ульляна была там з бацькам.

...Цяпер яна прывыкла да гэтага возера. Павольна лунала ў ягоных

[1] Локцік.

хвалях, наўпрост адкусваючы пялёсткі гарлачыка. Цяпер прывыкла. Тады ж – яно зачароўвала...

Ульлянка, скінуўшы ціжмы, вырвала руку з Адасевай далоні й прабеглася па вадзе ў неўтаймоўным экстазе.

– Куды ты? Вульця, стой – там спад! – гучна закрычаў ён, як здалося, нават перапуджана, што бясконца ёй спадабалася. Яна прыпынілася і ўжо асьцярожненька рушыла далей, гарэзьліва каламуцячы ножкаю глёўкі мылец.

– Ульціся! – хітравата гукнуў.

– Чаго табе? – запыталася з лёгкай раздражнёна-адчэпнай усьмешкай.

– А там п'яўкі! – урачыста-загадкава прамовіў ён у прадчуваньні ейнага нябеснага віскату.

Яшчэ доўга яна не магла дараваць яму гэткага падступства. Яна верашчала, нібы козачка ў гарбузох, – а ён спатольна рагатаў. А тады – падарыў цнатліва-белы азёрны гарлачык.

…Той самы, што кусае цяпер…

У чаўне плылі амаль моўчкі. Стрэліся позіркам – Ульлянка адвяла вочы. Глядзела ў неба, у ваду, дурасьліва пырснула на яго – толькі зморшчыўся й зноў цікаваў яе ледзь прыкметнай пяшчотнай усьмешкаю вачэй ды вуснаў… Увогуле ж, у яго быў чароўны, боскі ўсьмех – шырокі, адкрыты, шчыры – усьмех найвышэйшага гатунку. Калі ягоныя вусны азорвала лёгкае задавальненьне – здавалася, самое Сонца ўзыходзіць па-над грэшнай Зямлёю ды ахутвае праменнай яснотаю ўсё навакольле… Яна вырашыла глядзець наўпрост на яго, але ня вытрымала й хвіліны – абое сарамяжліва расьсьмяяліся.

– Ну не глядзі на мяне так!.. Ах, ты яшчэ й рагочаш? На табе! Вось табе! – знарок абліла яго вадою.

– Ульляначка, я ж буду ўвесь мокры, – бараніўся рукамі ды ўсё рагатаў.

– Так табе й трэба!

– Чаму так і трэба? Куды ж мне яшчэ глядзець, як усё астатняе я тут ужо бачыў? А ты такая цікавая.

Яму таксама падабалася ейная прыгожая, цудоўная ўсьмешка. Такая ж шчырая, як яна сама, але разам з тым і спакусьлівая, загадкавая, хітравата-гульлівая. Сьветла-ружовыя вусны з бялюткай дзявоцкай рысаю вакол – гэткія, відаць, анікога яшчэ не цалавалі. А маленькія ямінкі на шчочках – хараство якое! Цёмныя вейкі ды бровы. І няўрымсьлівасьць, несупынная дзіцячая няўрымсьлівасьць. Ён быў зусім іншы. Спакойны, ціхмяны, нават крыху сарамлівы. І моцны: казаў, шторанку пераплывае гэтае вялізнае возера, нават узімку. Менавіта аўтэнтычная мужчынская дужасьць і разважлівасьць найперш прывабліваlі яе, як бальшыню дзяўчат, адылі ўжо – бясконца добрыя шэра-блакітныя вочы ды цёмна-русыя валасы, што мякка атачалі шыю. Але ўжо праз колькі дзён за гэтай вонкавай дужасьцю яна пабачыць бясконца чульлівага, эмацыйнага, вытанчанага, шляхетнага чалавека, які менавіта праз тое прыланцугуе ейную жарсьлівую душу да сваёй ягласнае назаўжды.

Яны ўскараскаліся на курган. Адась апавёў, што акурат пад ім пахаваны той самы пан-ґвалтаўнік – яна колькі змогі ляснула кулачком па зямлі. І пра косткі напалеонаўскае вайны, на якіх ейны хутарок збудаваны, апавёў, чым бязьмежна ўразіў ейную рамантычную натуру. Потым паказаў рукой на ўсход. Чароўны золак! Навокал яшчэ цёмна, толькі кругавід чырванее танюткай істужкаю. Якое невымоўнае відовішча – вось бы дзе мастакам эцюды пісаць! Паступова чырвоная паласа пераходзіла ў пяшчотна-ружовую, тады, дзіва, але – у вясёлкавую, тады ў сьветлы-сьветлы кобальт, а тады, усімі адценьнямі сіняга й пралескавага, у чыстае блакітнае неба. У паветры лунаў водар хвоі, траваў, зачароўваючы дрыготкай сьвежасьцю расы.

Ранішні халадок прыемна перасмыкнуў цела. "Ну што сядзіш, як кадаўб! Бачыш – дзяўчына побач замярзае?!" – карцела сказаць ёй, бо ад холаду ўжо можна было падвязваць зубы. Але класічнае выхаваньне мамці-піяніcткі ўтрымала яе ад гэткае фамільярнасьці. Дый неўзабаве ён сам захутаў ейныя ногі ў сваю вышыванку.

– Так цяплей? – пяшчотна пытаўся, любасна мармылячы сабе пад нос адну даўнюю беларускую серэнаду ды расьціраючы ейныя босыя ногі.

Дробненькі дожджык ды накрапае –
выйдзі, дзяўчына, сэрца чакае!

Выйдзі, дзяўчына, ня бойся марозу –
я ж тваіх ножак не памарожу.

Я ж тваіх ножак не памарожу –
я ж твае ножкі ў шапачку ўложу.

Адылі, клапатліва агарнуўшы сабою, горача хукаў на далонькі.

– Дзякуй! – угрэўшыся, заспакоена адказвала яна.

...Ён заўжды чытаў ейныя думкі, але да сёньня рэагаваў на іх адэкватна. Да сёньня яна памятала яго надзвычай абаяльным, гарманічным чалавекам...

– Ульціся, а табе ня страшна сядзець вось так спасярод ночы ў лесе?

– Аніколечкі, ты ж са мною, – пачула, як ён хітравата ўсьміхнуўся. – Чакай, ты пытаешся, ці ня страшна мне з табою?

– Ну так, – чула ўсё той жа аксамітавы, загадкава-гульлівы прысьмешак.

– Дык ты ж не маньяк! – бесклапотна й не задумваючыся прасакатала яна, на што пачула ягоны шчыры рогат.

– А шкода, што не! – адчуў, як сьцепанулася ейнае цела. Яна запытальна зірнула. – Ды не пужайся ты! Ведаеш, што такое маньякі ў славянскай міфалогіі?

– Ня ведаю. А што?

– Гэтак колісь называліся зьнічкі, што падалі на двор тае дзяўчыны, якая страціла цноту. А яшчэ ў выглядзе маньяка нячысьцікі наведвалі сумных удовачак ды самотных маладзіц, мужы якіх былі ў далёкіх краях на заработках. Усяго толькі.

– Вой, жывыя сьмехі! Але ж і такіх паэтычных маньякаў трэ было асьцерагацца. А як?

– Ну сказаць штосьці кшталту: “Амін! Рассыпся!”

– Дык вось, альясік мой: “Амін! Рассыпся!!” – Ульлянка паціху пачынала вызваляцца ад свайго цнатлівага выхаваньня. Яны шчыра расьсьмяяліся. – А цяпер скажы мне, ці ты не баішся вось так сядзець спасярод ночы ў лесе? – цяпер ужо ейны голас набыў хітраватае адценьне.

– З табою? – па ейнай свавольнасьці Адась адчуў, што дзяўчына нешта ўдумала.

– Так, са мною. Мы ж, дзяўчаты, у звычайны дзень – усе паціху вядзьмаркі, а цяпер – купальскія ночы. Зараз вобмельгам перакінуся на русалку й заласкачу да сьмерці! – і кінулася яго казытаць колькі змогі. – Будзеш ведаць, як пужаць такою гаворкаю!

– Ульляначка, ясачка, годзе! Я ж козыту баюся! – порстка выкручваўся ад ейных зґрабных пальчыкаў. – Вунь лепей зірні – паказваецца крайчык сонца.

Жоўта-белая фарба засьціла сабою астатнія. Яшчэ халодныя сонечныя коскі рабілі сьвятлейшым усё неба...

Назад вярталіся падчас ранішняга панаваньня. Зноў гойдаліся на хвалях магутнага возера. Было проста добра з таго, што яны адны спаміж безданьню азёрнай ды безданьню нябеснай. І з колерам бездані зьліваўся сіні блакіт вачэй. Спадабанцы былі маленькай часткаю адвечнае прыгажосьці, існасьці быцьця. Плёс люстраваў белае сонца, хвалі бліскацелі залацінкаю. У іх, абганяючы човен, віравалі касячкі невялічкіх рыбінак. Ля берагу біла крынічка з фіялетавай вадою – яны пілі з далоняў наўзьмен.

Потым ён зноў падарыў букет: папараць, пяшчотна-бэзавы мак, піжма, валошкі. Ульлянка захлыналася ад шчасьця і ўдзячнасьці. Пах зусім здурнап’яніў ёй галаў: на адыходак яна птушкай плюснула яго ў шчочку й паляцела.

– Мне ніхто не дарыў шчэ такіх кветак! – чуў ейны шчасны вокліч. Самому ж падумалася: “А мяне ніхто шчэ не цалаваў так хутка, шчыра й пяшчотна”.

Вяршаліны стромкіх дрэваў у промнях ранішняга сонца таксама здаваліся залатымі. Невыславёна сьпявалі птушкі, іхні пошчак зьвінеў, нібы гук танкаструнных гарфаў, што нацягнуў сам Бог між небам ды зямлёю.

## III

У адзін з наступных дзён яна галасіла над падручнікам гісторыі, перачытваючы пра лёс філаматаў і філарэтаў. Пад час падрыхтоўкі да ўступных іспытаў, калі яна знаёмілася з гераічным, але насампраўдзе малашчасьлівым мінулым сваёй зямлі, яе ўжо ня раз агортвала скруха. І чым больш заглыблялася ў тыя нягоды, у тую несправядлівасьць беларускае гісторыі, тым большае пакліканьне да сваёй будучае прафесіі адчувала яна ў сабе. Вось і цяпер згадка пра расправу расейскага царызму над філаматамі – маладзенькімі хлапчукамі, студэнтамі – выклікала блізкія ўспаміны й навальніцу эмоцыяў. Ужо гады з два, як яна з сябрамі расклейвала па Менску саматугам напісаныя ўлёткі Беларускага Адраджэньня, за што ня раз мела сутычкі з міліцыянтамі, якіх цішком тады называлі

більдзюганамі. А цяпер падумалася: “Як душылі філаматаў, так і нас цяперака душаць. За стагоддзі нічога не зьмянілася!” І яна не знайшлася нічога лепшага, як па-дзіцячаму расплакацца. Але тут на парозе паўстаў Адась. Дзіўна, здаецца, яны дамаўляліся сустрэцца пазьней.

– Што ты, Ульлянка? Пакрыўдзіў хто? – укленчыў ён да яе. Адной рукою мякка трымаў ейную даланю, а другою – пяшчотна прымаў сьлязінкі са шчок.

– Чаму, Адась, скажы мне? Я не разумею! – бездапаможна хліпала гэтае малое дзяўчо.

– Што не разумееш? – няўцям перапытваў ён. Ульлянка моўчкі тыцнула пальчыкам на адпаведную старонку падручніка. – Ах, вось яно што! – супакоена ўздыхнуў.

– Ну чаму наш народ такі несьвядомы? Чаму ён дазволіў так абкрасьці сябе, дазволіў сьцерці з памяці амаль усё роднае, дазволіў забыць, хто ён і адкуль?

– Даражэнькая, але ж ёсьць і тыя людзі, якія па апошні ўздых крочаць сюды, у родны кут, цалуюць зямлю пад нагамі сваімі! – паспрабаваў быў ёй запярэчыць.

– Дык тым больш ганьбы ўсім астатнім. У іх ёсьць усё: бацькаўшчына, мова, свае сьвятыні, багатая й цудоўная культура, традыцыі, мудрасьць народная. А яны, маючы, ня цэняць. Ім ніхто не забараняе быць беларусамі – а яны й не зварухнуцца ані, каб гэта было ня простым спалучэньнем літар на паперы, а гучала годна: “Я – беларус!” І ў той мове, каб усе паверылі, што ён насамрэч беларус, а не манкурт які. Я не разумею, Адасю, няўжо гэта так цяжка – проста любіць сваё, проста любіць сябе? – яна рабіла акцэнт амаль на кожным слове апошняе фразы. – У народзе кажуць: “Шануй свае песьні, бо сьпяваюць нават жабы ў балоце”. Дык хіба ж беларус горшы ад тае жабы? Чаму так здараецца, Адасю?

– Ульціся, разумееш – спыніцца прасьцей. У беларусаў зусім не ваяўнічая душа. Мы надта далікатныя й памяркоўныя, каб запялеціць дулямі пад нос таму чужынцу. Высакародныя й добрыя. Апошнім часам, праўда, маладасьведчаныя. Праз што й пакутуем, – ён глядзеў на яе з захапленьнем і павагаю, ягоны голас гучаў невымоўна лагодна.

– Божа, як крыўдна, як боляча й прыкра. Так хочацца ахутаць гэтую зямлю, нібы любую дзяўчыну.

...Як далёка цяпер той боль... яна вычувала яго мо ня меней абвострана, але ўсё ж ён быў нібыта засьценены ўласнай жыцьцёвай фатыгаю… У траўні акурат была ў Менску, здалёк пабачыла, як здымалі Пагоню. Яны з Адасем так верылі калісь, што яна будзе дзяржаўнаю – і яна сталася! – на жаль, ненадоўга й Адась гэтага зусім ня бачыў, не пасьпеў парадавацца. Было такое адчуваньне, нібы ад ейнае душы наўпрост адрываюць рыхтык тую часьцінку, без якое аніяк ня можна жыць. Такое гнюснае пачуцьцё, калі ручаіны сьлёз душаць да нематы, прыпыняюць рытмы сэрца, перацінаюць подых, бывае толькі ад усьведамленьня несправядлівасьці, бездапаможнасьці й крыўды… Як далёка цяпер той боль…

– Ульціська, ты ж ня ведаеш, як хочацца ахінуць любую дзяўчыну, –

прамовіў кпліва, хочучы яе падбадзёрыць, бо гэткім укрыжаваньнем яна рабіла кепска адно сабе.

– А ты ведаеш, што так пасьміхаешся? – зьлёгку пакрыўдзілася.

– Здагадваюся. Але мой сябра тутака большае рады дасьць. Гэта Янка ў нас да дзяўчат ласы. Дарэчы, днямі ён прызнаўся, што неяк заходзіў да цябе, – ужо хацеў пазнаёміцца: празумкаў мне ўсе вушы – якая там пекная новенькая месьцічаначка зьявілася на хутары!

– Так-так, быў нейкі дзівакаваты хлопец. Зайшоў, нібы ў ліхаманцы, нічога не гаворыць. Я падумала, мо хворы які, напужалася. Хацела лоб пакратаць, дык уцёк, – сказала, нецямліва гмыкнуўшы ды мякка пасьміхнуўшыся.

– Праўда? Ну, тое мядзьведзь у лесе здох, што Янка ад дзяўчыны ўцёк! Відаць, закахаўся… Янка-Ульлянка! – цьвяліўся Адась. Ён вельмі хацеў суцішыць, узьвесяліць гэтую чароўную дзяўчыну.

– Аге ж! Чаго б ён тады зьбег? – ейныя вачаняты гарэзьліва забліщчалі.

– Ну, ці мала што з ім там здарылася… Але, я гляджу, ты крыху супакоілася. Вось жа цудоўна! Ня зношу, калі паненкі-імостачкі разгадоўваюць золь! – яму ўсё ж ўдалося дабраць такога дасьціпнага слоўца, каб забраць ейную ўвагу ад скрушных думак: яна проста зарагатала на апошнюю фразу…

– Так, дзякуй табе!... Але ты дарма кпіў з мяне, Адасю, бо я ведаю, як хочацца быць захінутаю, – мовіла тутака зусім па-даросламу, з нейкай філасофскай здуменнасьцю.

Нібы сонца й месяц падчас зацьменьня, яны сустрэліся позіркамі. На імгненьне ў сьвеце зрабілася цёмна. На імгненьне дзьве душы рассыпаліся па ўсіх лукавінах сваіх глыбозных пячораў незьлічоным зорным пылком, уважліва вывучаючы кожны канцік. Усяго імгненьне дзьве душы шпарка імчэлі насустрач па пяроцемкавых лабірынтах паглядаў. Спаткаўшыся ў самым асяродку крывіцкага салярысу, яны трывала паядналіся ў адну вялебную жывую цэласьць: іхняе конавае стрэчаньне мякка агучыў вятрыска сваім дыхтоўным акордам.

– Але ж чаму… ты… так… на мяне… глядзіш? – зьдзіўлёна казала ў ёй ейным голасам іхнае зьбянтэжанае сэрца.

– *Ты запытала, чаму так на цябе я гляджу: ты ж ані цар, ані Бог – я даць адказу ня мог,* – адное, што адолеў прамовіць ён, павольна прасочваючы ягодкамі пальцаў уяўны сьлед ейняе нядаўняе сьлязіны ад вачэй да станіку.

– Спадзяюся… я спадзяюся… табе хопіць інтэлекту… не сапсаваць сяброўства?.. Ну, не глядзі на мяне так!.. Адвядзі свой пагляд, не глядзі, – разгублена мармытала штосьь няўцямнае. Бачыла, як ягоныя вусны расталі мілоснай усьмешкаю на такую даверлівасьць.

– А калі… не змагу? – ня менш разгублена, але памяркоўна пытаўся ён.

– Тады… тады баюся, што інтэлекту… ня хопіць… мне, – апошняе слова, нібы штось цяжкое, бухнулася на выдыху ў ваду.

Здавалася, ён чакаў адно іх, гэтых словаў: схаваў яе ў абдымках, моцных і прагных. Яна была ўжо мляваю й бязвольнаю ў ягоных руках. Спачатку дробны марозік прабег па ўсім целе, кожная частачка прадрыжэла, нібы крылцы патрывожанае стрэлкі. Яна з першае сустрэчы зразумела, што ён чымсьці падабаецца, але не магла ўцяміць, што ж так неадольна прынаджвае яе. Калі яны разам сустракалі золак, Ульлянка ўсё яшчэ

варажыла: ці ж будзе чапіцца й як ёй таго ўнікнуць? Аднак першымі спатканьнямі хлопец паводзіў сябе настолькі прыстойна й высакародна, што ў ёй абудзілася наўпроставая цікаўнасьць і павага: ёй самой заманулася ягоны цалунак. І Адась падарыў яго, падарыў так, што Ульлянка адчула ў ім сапраўдны культ цалоўнага дарэньня! Ён сцалоўваў увесь ейны твар і шыю – шчэ трохі няўмела, нязґрабна, але вельмі горача, палка й аддана ды, нібы задурманены, нашэптваў нешта ласкавае. Яна соладка адгукалася. Скрозь сопкі туман жаданьня цвэгалі кволыя галасы.

– Напэўна, я кахаю цябе.

– І я, напэўна.

– Гэтымі днямі я думаю адно пра цябе. Такое пачуцьцё, нібы ведаю цябе здавён-даўна.

– І я таксама. Як толькі паціснула тады тваю зялёную ад красак руку, дык адчула, што гэта ты.

Шчасным, прасьвядным маленьнем дасягалі іхнія душы нябёсаў, дзякуючы за імгненны імпэт, за раптоўнае, лагоднае паталеньне, поўнае смугі й неапетае асалоды.

– Я маю для цябе дарунак, – шэптам мовіў каханы.

– Зноў букет? – люба ўсьміхалася каханая.

– Вялікі-вялікі. Гэта мой найлепшы твор. Хадзем?

Адась падняў яе на рукі й панёс, быццам крохкую каштоўную вазу, адорваючы крышталінкамі цалункаў. Нёс далёка на поплаў. А там – апусьціў перад вялізным кілімам з папараці, лісткоў руты-мяты й мелісы, кветак рамонкаў ды валошак, з пялёсткаў дзікіх руж.

– Хадзем, – ціха паклікаў яе за сабою.

– Не, там чмялі. Мне будзе балець, – шчэ трохі наравілася яна.

– Балець будзе ня больш як зямлі, па якой ты ступаеш штодня, – утрапёна лашчыў ёй рукі: выцалоўваў кожнае сукаленца, кожны пазногцік, кожную ягадачку ейных вытанчаных пальцаў, паглынаў кожную цальку духмянае скуры ейных утульных даланькоў. Апантаная лучнасьць надоечы рахманых пальцаў выдавала на вянок санетаў, суплецены натхнёным паэтам з веснавое палітры. – Хадзем!..

– Навошта ж ты паабцяў столькі кветак, калі ім таксама баліць? – яна ўсё імкнулася спыніць час ды ўсьвядоміць, што гэта, што з ёй адбываецца.

Ён мякка ўзьняў рукою ейнае падбароддзе ды любасна зазірнуў наўпрост у вочы. Ёй падалося, што гэта быў ня погляд, а зорны россып дасяг самых глыбіняў ейнае душы. Так, яна пакахала менавіта гэты неверагодны россып. Яшчэ першымі днямі знаёмства падавалася, што яе вабяць дужасьць, гожыя й мужныя рысы твару. Але цяперака адчувала напэўна, як памылялася ўсяго колькі дзён таму.

– Ведаеш, кожная кветка чакае такое шчаснае ахвяры. Калі ты рвеш сьцябліну на радасьць і з радасьцю, са словамі дараваньня – яна абавязкова даруе. Мы забыліся, што ў Прыроды таксама варта час ад часу прасіць прабачэньня, – соладка кратаў вуснамі ейныя лоб ды вочы.

Гледзячы ў прыўкрасныя азярыны ягоных мяккіх вачэй, яна ня бачыла іх. Зараз яе ўражваў і супакойваў бясконца багаты сусьвет па-за гэтымі вачыма. Толькі ягонае нутраное багацьце магло заўжды так выкшталцона спакушаць яе.

– Божа мой, які ж ты, Дасюлю, прыгожы! Вось тутака, прыгожы! – яна

разьвяла яму каўнер кашулі й, схіліўшыся да ягоных грудзей, ціхутка пацалавала напоеную высокім сонцам душу. Яна хацела яшчэ нешта спытаць і не змагла: вусны былі ступленыя Адасевымі, а галава неяк сама адкінулася на ягоную гарачую даланю.

– Чаму ты так... упэўнены? – апошні прыліў сьвядомасьці выштурхнуў гэтыя словы.

– Таму што ты гэтага бажаеш.

І нізкія аксамітавыя галасы патанулі ў сьпякотным подыху й звар'яцелым баі крыві ў кожнай судзінцы. Пацалаваньні, што найраскошнейшыя матылі, зьляталі ёй на вусны, на шыю, на плечы. Лёгка ды незаўважна ён шмаргануў забарскі шляпрочка і танюткае адзеньне сьлізганула долу па асмуглым целе. Адным махам скінуў сваю славутую вышыванку, і ейныя дробныя, пругкія грудкі апяклі ягоную скуру набрынялымі пупышкамі. Адась абдымаў настолькі моцна-пяшчотна-прыемна, што забаяцца не было чаго. І цалаваў, цалаваў, цалаваў, нібыта хацеў духам прасякнуць у ейную сутнасьць. Яна магла нат не трымацца зямлі й лунаць на ягоных руках. Была мяккая і пакорлівая, што разьмякчаная скульптарам гліна. Раптам, як пёрка, яна ўзьляцела й сьледам апусьцілася ў духмяную квецень кіліму. Кашлаты слой пялёсткаў прыемна казытаў сьпіну. Паўдзённае сонца моцна бліснула ў вочы й закружляла, як вада ў віры. Шантовы водар зусім здурнап'яніў. Адась казытаў ейны жывоцік маленькай сьцяблінкаю ля самага беражку таненькіх бялюткіх майткоў, сьцягваючы іх зубамі ды вуснамі, паступова вызваляючы з палону неруш набрынялага расою сэрцайка. Лёгкі халадочак маланкаю сьцепануў усю ейную істоту. Трымценьне ды ягласьць прымусілі Ульлянчыны пальцы варушыцца сьмялей. Чарговая хваля дрыжыкаў схамянула цела: нібы пекны гатычны сабор, узьняў да нябёсаў сваю гонкую вежу ягоны пругкі сталаґміт. Яна зірнула на зґрабныя мускулістыя ногі і гэта ўратавала яе ад непрытомнасьці: новым, яшчэ больш моцным жаданьнем кроў лінула ў скроні. Цнатлівае цела лёгка адгукалася на спрадвечны покліч прыроды. Ён абавіў ёю свой стан – і яна паслухмяна легла яму на сьцёгны. Тады ён усклаў яе на свае дужыя рукі – яна вадаспадам сьцякала з яго. Цалаваў ёй жывот, сьцёгны, кунежыў малую карпатую цясьнінку й дробную ружачку, поўную водару траваў... Адзін паэт сказаў, што кветка – гэта ліст, звар'яцелы ад каханьня... О, любаярлівасьць! Слодыч, ласкота, спатоля. Яна больш не баялася. Цалаваньнямі лёгкімі, прахалоднагарачымі абсыпала яго, шаравалася аб яго шчочкамі ў шчасным забыцьці й піла салодкі нектар мілосьці. Аддаючы сябе ды ўвесь сьвет на ахвяру, яны бачылі Бога. Зорны сусьвет сыходзіў тым часам менавіта з іх. Дзьве гожыя гліняныя фігуркі, разьмяклыя пад паўдзённым сонцам – цяпер гэта быў адзіны суплёт любові й асалодных стагнаньняў.

– А-д-а-а-а-сь! – сонечная зігавіца прасякла ўсё неба ды слых Адася.

– Табе бо-о-ляча?

– Я стрываю любы боль ад цябе. Я кахаю цябе!

– І я кахаю цябе!

***IV***

Гэтае ночы яна трымала сваё абяцаньне. Трывала боль ґвалту, боль

крыўды. Яна марудна правяла рукою спаміж сьцёгнамі – запозьненае рэха гаркавае начное асалоды перасмыкнула ачунялае цела. Адштурхнуўшы гарлачык хваляю вады, яна пайшла на бераг. Там сядзеў Янка, трымаючы ейную вопратку.

– Янка? – яна павярнулася бачком, затуляючы грудзі. – Даўно ты тут?

– Ішоў за табою.

– Дай мне апрануцца.

– У цябе яшчэ ёсьць сілы саромецца? Я ніколі не зраблю табе так, як ён.

Яе выбіла з раўнавагі невялічкая хваля. Яна загайдалася – Янка пасьпеў падхапіць. Захінуўшы махрыстаю прасьціною, вынес з вады.

– Падбяры ногі, – загарнуўшы іх, як у пялюшку, хлопец пасадзіў яе сабе на калені. Яна слухалася.

– Проста пасядзі.

І яна сядзела. Паслухмяна й ціха. Ён павольна абціраў ёй валасы, цела, баючыся ўчыніць боль. Асьцярожна абсмоктваў мясьцінкі вакол ранак, залізваючы сьлінаю, як адданы сабака. Пяшчотна цалуючы. І яна ўспрымала ўсё гэта як дадзенасьць… Добры, любы Яначак, закаханы ў яе Адасеў сябра – колькі ў ім трываньня, мужнасьці й пяшчоты, колькі любасьці да яе, колькі неадольнае мілосьці!

...Быў яшчэ й трэці сябрыска – Стасік: хлопцы, як у адной кашулі хрышчаныя, – і вада не размые. Пад час унівэрсітэцкае сябрыны таксама ўсё ўлёткамі бавіліся, якія тут жа й штраблявалі: пасярод балота, дзе ў іх нават адмысловая патаемная хацінка была! Ажаніўшыся, Стась пайшоў у прымы – цяпер яго тут рэдка бачылі.

Янка ж пазнаёміўся з ёю: больш ён, першы тутэйшы бабздыр, не паказваўся ні на адной вячорцы. Вісус, ветрагон, шалахвост, памаўзьлівы кот, чужаложца – вось толькі частка тых эпітэтаў, якімі адорвала яго вёска! Лявоньця казала, што цікаваў Ульлянчыну хату раней за Адася, а падысьці – ня змог… Аднойчы ён выпадкова завітаў да яе: бледны, у нярвовым трымценьні. Першае, пра што падумала – у яго фэбра, трасца. Яна паклала далонь яму, тады яшчэ незнаёмаму хлопцу, на лоб – ці мала што з чалавекам – яго скаланула так, што Ульляне зрабілася страшна. Мармытнуўшы нешта накшталт: “Мне праўда нядобра, лепш пайду”, – ён учвалам, віхрам выскачыў з хаты…

…Янка шыбаваў сьцяжынай па поплаве й нярвова шкуматаў прыдарожныя расьліны. “Ёлуп! Дурань! І што на мяне найшло? Янка дзеўкі збаяўся! Каму скажы – шкелікамі абкладуць. Як пабачу яе – усё нямее: ані зварухнуцца, ані слова мовіць. Так і заікам можна застацца. Такое магло б здарыцца з цнатлівым Адасікам, які ў высакароднасьць гуляе: ня можа ён, бач ты, без каханьня! Ідыёт!” – Янкавы шчокі пунсавелі. Ён збочыў са сьцежкі й шпарка паджґаў скрозь травы, што былі яму ў пояс. Стаміўшыся, паваліўся долу. Грыз нейкую сьцяблінку, хацеў упарадкаваць свае разбэрсаныя думкі, аднак усе яны, вíруючы, сыходзіліся да аднае: “Ч-ч-чорт!”…

А яна пазнаёмілася з Адасем. Калі сябра, акрылены, апавядаў яму пра свае спатканьні – нейкая здрадная рэўнасьць абягала Янкава сэрца. Ды ён, ведаючы сваю памаўзьлівую натурку і ўпершыню бачачы такія нат-

хнёныя, азораныя вочы сябра, быў па-свойму рады за яго й старанна гнаў ад сябе гэтае колкае пачуцьцё. І што гэта была за чорная панна, якая выядала ягоную душу, нібы ржа, ён адчуў толькі на іхнім вясельлі: калі ўрэшце дапяў, што страціў для сябе Ульянку навек… Банальна? Але ж тады ён насамрэч быў гатовы легчы ў прысак Пампеі…

Гатовы й цяпер… “Мой бажок! За што ён яе так?!” – мякка дакранаўся вуснамі да ейных скусаных.

...Янка быў хросным ейных блізьнятак, пяць гадоў клапатліва гадаваў іх, быў Ульяне за гаспадара: яны разам сьнедалі, палуднавалі й вячэралі, разам рабілі штосьць на гасподзе й пралі бялізну, разам купалі дзяцей, разам перажывалі радасьць іхніх першых усьмешак і крокаў, боль іхніх першых зубак і захворваньняў, адно – ня клаліся спаць. Упрывечар, залюляўшы малых ды прапяяўшы ім калыханкі, ён заўжды выпраўляўся дахаты. Яна неяк слала яму ў суседнім пакоі, але ён сам не любіў гэтых чыста сяброўскіх таначовак, бо тады скрозь цалюткую ноч ня мог зляжыць вачэй, услухоўваючыся ў начную цемру, раз-пораз чуючы за сьцяною ейны натужны паўночны стогн. Янка без адмовы слугаваў ёй удзень, але начаваць у яе, ды ня з ёю – было нясьцерпна! На ранак, калі ў школе не было заняткаў, ён вяртаўся да яе зноў, усё глядзеў, быццам на багіню, глядзеў, але маўчаў…

…Ягоны пакутлівы, утрапёны позірк – шкада было хлопца да болю. Што ж гэта за пякельны боль, калі ты анічога ня можаш даць чалавеку, які кахае цябе! Адчуваеш сябе як грэшнік, як забойца: душа б’ецца надвое. Агідная, сьлізкая безвыходнасьць… А ён усё цярпліва хадзіў, слугаваў, глядзеў ды маўчаў, анічога ня просячы наўзамен.

Дый хіба мог ён пра нешта прасіць, бачачы ў ейных вачох адно суцэльнае чаканьне – чаканьне не-яго! Дзіўна, але за апошнія колькі гадоў яны нават сталіся падобнымі да Адасевых: зь ясна-валошкавых паспакайнелі да шэра-блакітных… Глядзець у іх, а бачыць не-яе – было для Янкі вяршыняю мужнасьці!

Неяк ён правіў плот ды абадраў скроню: Ульяна адно хацела спыніць кроў, а яго зноў перасмыкнула ад ейнага дотыку, як калісьці. Тады Янка, схапіўшы яе за рукі, апантана цалаваў іх, вадзіў ейнай даланёю па сваёй шчацэ. Адылі дакрануўся да ейнае шчакі рукою й адразу ж адхапіў яе, нібы ад агню, жорстка скулачыўшы. Зноў крануўся, марудна правёў пальцамі па шыі, грудзёх, баку, сьпіне. Ульяна ўся выпруцілася й застыгла: яна ведала, што некалі так будзе. Ён датыкнуўся патыліцы й ледзь не прымусам прыцягнуў ейныя вусны да сваіх. Гэта быў не пацалунак, а пакутнае, ґвалтоўнае крананьне. Адчуваў сябе, нібыта краў штосьці. Яна адхінулася было, але ж ён як прысмактаўся, молячы працягнуць шчаснае імгненьне.

– Не-е! – Ульяна ўсё ж парывіста адштурхнулася.

– Ён жа мёртвы, разумееш ты? Мёрт-вы! – шалёна выгукнуў Янка.

– З чаго ты ўзяў? – спытала засьмягла-абурана. – Ніколі не кажы так больш, чуеш? Не кажы, бо тое няпраўда! Я адчуваю яго клеткамі, штоночы ён сьніцца мне, і я ведаю пэўна: ён – жывы!!!

Пачутае разьюшыла яго яшчэ болей. Ён прыцягнуў яе да сябе, моцна трымаючы, ліхаманкава сцалоўваў усю: вусны, шчокі, падбароддзе, шыю. Яна не вырывалася, толькі раптам заплакала. Сьлёзы заўжды былі ейнай абаронаю… Ледзьве чутны шэпт: “Пусьці!” – драпануў па душы лязом

ды ўтаймаваў тое дзікае парываньне. Яму заслала вочы: пэўна, гэта таксама былі сьлёзы. Ён ведаў, што больш аніколі не дазволіць сабе такога. Больш аніколі яе так не пакрыўдзіць. Больш аніколі не адчуе гаркавага прысмаку ейных дрыготкіх абураных вуснаў…

Мінулася тры гады. Ён па-ранейшаму кахаў, хаваючы свае пачуцьці. Былі іншыя жанчыны, аднак аніводная не затрымалася больш як на колькі дзён. Аніводная так да сябе не прысушыла...

Ён мілосна прыгарнуў яе да сябе. Ціха пагойдваючы, усё лашчыў ейныя валасы – чамусьці яны пахлі мятаю. Іхні мяккі лагодны вадаспад, што заўжды чараваў яго, цяпер горача прапальваў рукі. І скура нібы вылузвалася, лупілася на іх. А сэрца нібыта ня чула, бо ў немай шкадобе было сьцятае ад болю за яе, за тую адзіную, любую. Удыхаючы ейны жах, пачуў сьлёзны шэпт – зусім іншы ад колішняга, поўны маленьня да ласкі.

– Яначак, прасьпявай мне калыханку. – І ён сьпяваў. Бяз сьмеху, бяз кпінаў, з амаль бацькоўскай цеплынёю ў голасе. Сьпяваў, ахутваючы ейныя раны ціхай аксамітавай лагодаю, спавіваючы журбу мяккім вэлюмам спагады.

Люлі, люлі, люлі,
Пайшоў кот па дулі.
Памарозіў лапкі –
Пайшоў грэцца ў хатку…

Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
А котачка адняла
І Ульлянцы аддала…

Дзеля гэтае роднае істоты, якую бездапаможнасьць і боль уляпілі ў яго, як плод, ён быў гатовы на ўсё. Каб толькі прымеў, разьвітаўся б са сваёй цэлаю скураю ды прышчапіў замест ейнае параненае. Каб толькі прымеў, аддаў бы кроў ды подых і стварыў ёй новую душу, вольную ад ранейшых пачварных успамінаў, душу, якую б шчыра загойваў пры найдрабнейшым трымценьні.

Пайшоў каток на таржок,
Прынёс каток піражок.
А котачка адняла
І Ульлянцы аддала…

Пайшоў кот на рыначак,
Прыкупіў разыначак.
А котачка адняла
І Ульлянцы аддала…

– Яначак, не магу я так больш! Не магу! Змардавалася. Мне той патрэбны, хто разумее мяне, хто кахае, а ён – сядзіць, як стод. Ён ня хоча ані гаварыць са мною, ані бачыць, ані чуць! А сёньня – вось ягоная ўвага, – на вачах праступілі смачна-гаркавыя сьлёзы. Як палюбіла яна іх за апошнія гады. Цяпер нават магла адрозьніваць іхні прысмак – тое быў улюбёны напой.

Любаснымі пацалаваньнямі Янка зьбіраў кроплі гаючае вады з Ульлянчыных шчок, каштуючы саланаваты смак ейных душэўных пакутаў. Боль, які ён зараз вычуваў вастрэй, чымся калі-небудзь, і пераймаў праз танюткія нярвовыя кропкі языка, сягаў самых глыбіняў ягонае сьвядомасьці. Як хацеў гэты хлопец бачыць ейны счырванелы прыпухлы твар весялейшым, бачыць дзівосную здуменнасьць вачэй, што паступова наталяюцца шчасьцем. Звычайным чалавечым шчасьцем. Дзеля таго – ён усё зробіць, дзеля таго – ён усё аддасьць. Ціхія, бясконцыя сьлёзы каханае – якому б акіяну падарыць вашэцяў?..

– Я пайду ад яго, Янка!

– Ку-ды?

– Да цябе пайду. Так, да цябе, – апантана пачала сцалоўваць ягоны твар.

– Ульлянка, ты памыляешся, ачомайся!

– Не, не...

– З-за хвіліннага імпэту ты будзеш потым наракаць на сябе.

– Не...

– Ты не кахаеш мяне.

– Кахаю...

– Няпраўда! І ты гэта ведаеш лепш ад мяне!

– Кахаю!

– Ну няпраўда ж! Ну зірні мне зараз шчыра ў вочы й скажы: толькі ня гэтае самотнае “кахаю” – абы сказаць, абы мне запярэчыць – скажы ўсе тры словы разам, тры такія банальныя, але так гарманічна суплеценыя стагоддзямі словы, якія абрынуць, адпусьцяць цябе ў мае недаверліва-прагныя абдымкі назаўжды! – прамаўляў жарсьліва, дужа абдымаючы яе адной рукою, а другой, трымаючы падбароддзе, разгарнуў ейны твар да сябе. Яна ж… не ўздымала вачэй…

– Яначак, мы ж так добра ладзілі разам… – з грудзей вырваўся адно жальлівы стогн.

– Гэта ты ладзіла, табе было ня так скрушна, калі я быў поруч! А хоць адзін-адзіны раз ты падумала пра мяне, пра тое, што я вычуваў поруч з табою?! Бачыш, ты ня можаш сказаць мне тых простых словаў, што яму, але ж… назавеш мяне зараз ягоным імем! – адчайна выгукнуў ён.

Яна са злосьцю зірнула на яго.

– Жорсткі! Які ты жорсткі! – лупцанула кулачком яму ў грудзі й адхіснулася.

– Даруй мне, даруй, – я дурань! Даражэнькая мая, я не хацеў на цябе крычаць, даруй! – мармытаў вінавата-разгублена, гладзячы яе па галаве.
– Ну, проста ў жорсткасьці мяне яшчэ ніхто не абвінавачваў, – прамовіў зьлёгку пакрыўджана й расчаравана. – Супакойся, Ульлянка. Твае нервы спляжыліся ўшчэнт.

Ён стуліў ейныя маленькія кулакі ў сваіх цёплых далонях, ізноў лашчыў ёй валасы. Яна адасоблена сядзела на ягоных каленях.

– Янка...

– Што?

– Ці ня ты, Яначак, заляцаўся да мяне ўсе гэтыя гады?

– Я.

– Дык што ж цяпер?

– Анічога. Лёс мой такі – сяброўскі. Заляцаўся – як саламянай удавіцаю была. А што цяпер – сябру дарогу перасякерыць?

– Я ж сама жадала.

– Ты не жадала. Гэта ня ты. Цяпер – толькі падмануць сябе магла.

– Мажліва. Але менавіта цяпер мне так патрэбны гэты падман. Мне так ачамярэла праўда... Янка, а калі б ты насампраўдзе быў неабходны, няўжо не пусьціў бы, няўжо б прагнаў, няўжо я табе больш не патрэбная?

– Ты й так мая. Назаўжды мая.

– Але ж ты не адказваеш мне.

Ён маўчаў.

– Ты ніколі ня зробіш гэтага, ніколі ня кінеш Адася. Ты занадта моцна пакахала яго калісьці. Ён цяпер хворы, паспрабуй зразумець. Яму дужа цяжка, бо ён усьведамляе тое, што вычварае з табою. Яму патрэбныя

твой клопат, тваё каханьне, твае спачуваньне й пяшчота. Але не празьмерныя. Сёньня ты, відаць, перабрала з пяшчотаю. Трымайся, Вулечка. Якім бы ён ні быў – ты будзеш кахаць яго. Гэта ж відочна.

– Яне, адвязі мяне на той бераг. Мне трэба пабыць адной, – нібыта ня чула яго. Яна цьвёрда вырашыла, што цяпер ёй жыцьцёва неабходная чыясьці іншая пяшчота, не Адасева. Ейны голас прагучаў хоць і досыць катэгарычна, але нібы з замагільля. І яна зьлякалася. Рашучасьць і няўпэўненасьць аднолькава трывала агарнулі цяпер ейную душу. Ульляна ўжо сама не разумела: вагаецца яна ці рушыць наперад.

У чаўне плылі маўкліва. Яна адважна-пужліва тулілася да сяброўскага пляча ды з боязьзю ўяўляла, што праз колькі хвілінаў здрадзіць мужу. Ніколі ня думала, што здраджваць можна й ад страху і што здраджваць так страшна, але часам – так неабходна. Калі яна зараз не натоліцца чужою пяшчотаю, дык назаўтра, як наўе, зьнікне з першымі сонечнымі касулямі. Яна ведала, што ніколі ня кіне Адася. Ведала, што зробіць Янку боляча. Суцяшалася тым, што падорыць спатолю, імгненнае збаўленьне ад усіх пакутаў і сабе, і яму… І ён разумеў, што адплысьці ад таго берагу будзе ўжо ня здольны… У хмызьняку яна яго пацалавала.

– Янка, ты памятаеш пра надпіс на муры ў Пампеях? – *“калі ты ведаеш, на што здатнае каханьне, і калі ты мужчына, пашкадуй мяне, не кажы “не” і дай мне ўвайсьці”*… Ты ня можаш пакрыўдзіць мяне вось цяперака, менавіта зараз. Мне ня выжыць без тваёй пяшчоты, – прамаўляла, як сьлёзную літанію, нібы ў бездань, пазіраючы ў ягоныя прыгожыя вочы.

– Памятаю, мая дарагая! – схаваўшы твар у ейных духмяных жытнёвых валасах, ён палка ўдыхаў ёй у вушка ўлюбёныя радкі з Караткевіча, выцалоўваючы ёй шыю ды твар амаль на кожным слоўцы.

“Ну схлусіў бы!.. Хаця б перад лютай
Гэтай сьмерцю, халодная кроў,
Перад ноччу на двое сутак,
А пасьля на дваццаць вякоў.
Камні гэтыя сочацца болем
Горай страшнай пякельнай смалы…
Дык чаму ж твой прызыў непатолены
Больш за ўсё ў маім сэрцы баліць?
Вось агонь гуляе сьвятынямі,
Гіне ў выбухах гор града…
………………………………
Калі нешта і зараз загіне,
То адной любові шкада.
Спапялёны такімі ж мукамі
І патолены ў той жа крыві,
Да цябе я працягваю рукі,
Твой двайнік па сьмерці й любві.
Праз мільёны ўдараў і ранаў,
Заступаючы шлях журбе,
Мая даўняя, мая жаданая,
Не крыўдуй, я іду да цябе”.

Дзеля гэтае роднае істоты ён заўжды быў гатовы легчы ў прысак Пампеі…

Яны паглыналі адно аднаго. Подых сьмерці й неапетае прасьвяды цкаваў іхнія пацалаваньні. Выбух пяшчоты спальваў іхнія целы. Яна сцалоўвала хлапца ад вачэй да ягодкаў на пальчыках ног, наталяла-насычала вуснамі кожную ягоную часьціначку, жарсьліва аддаючыся кожнай сваёю.

Нібы сівы вулкан, зьнямоглы ад стагодняе прагі чаканьня, яны вызрыналі шалёную ягласьць. І ўсё было ня сорамна, і ўсё-ўсё было прымальна, і ўсё-ўсё-ўсё было высакародна й годна ў гэткай пякельнай агоніі. Тое была ня здрада, а адчайная спроба давесьці сваім збалелым душам, што яны ўсё яшчэ жывыя. У чалавеку ёсьць толькі адно непрыстойнае месца – душа. Яе адзіную, запэцкаўшы – увек не адмыеш!.. Згустак любові ды асалодных енкаў. Ягоныя ярка-ружовыя, выразныя вусны чынілі невыславёны экстаз. Сп’янелыя карыя вочы бачылі неба і, здавалася, упершыню разумелі яго. Адась неяк казаў: “У кожнае валошкі – свой адметны пах, нават смак, непаўторны”. У кожнае любові – таксама. Пяшчота, пяшчота-а, пяшчота-а-а!!! Пацалаваньне твару. І канец. Усяму. Вось такім, відаць, і будзе канец сьвету. Ціхім, лагодным і гарманічным, зацукраным ад кунегі, заспакоеным ціш-ш-шаю...

У чаўне зноў плылі маўкліва.

– Янка…

– *Песьня пяе, як удовіна сына, Янку каханьне згубіла; Там, дзе панура схілілась каліна, Беднага хлопца магіла,* – ягоныя вусны ахутала гаркавая ўсьмешка.

– Ты пра што, Янка?

– Так, не зважай, гэта Багдановіч... Ульлянка, я быў шчасьлівы… Але… Хутка я, відаць, паеду да дзеда.

– Не кідай мяне, мой Палямідаж[1], – яна сама не зразумела, чаму назвала яго так.

– Палямідаж?.. Так-так… Усё слушна… Не хвалюйся, любая. Я заўжды буду з табою. Заўжды буду тваім анёлам-ахоўнікам, – прамовіў мужна, але голас ужо быў афарбаваны нейкай няўлоўна-гульлівай жалобаю.

– Янка, я буду чакаць... ц-цябе, – тое была чыстая хлусьня. У кожным гуку гэтае фразы адчуваўся цень, што сыходзіў ад прывіду ейнае спляжанае душы. Ульляну апанавала якаясьці несьвядомая трывога. І страх…

– Ну-у вось што, зараз ты пойдзеш са мною й пакуль пажывеш у мяне. А я паразмаўляю з Адасем. Малых ад Лявоньці забяру сам, – мовіў вельмі сур’ёзна.

– Чакай, я не магу так адразу. Я ж не ўцякачка! – перапужалася Ульляна. Яна не разьлічвала на такую рашучасьць ды ўжо гатовая была выракацца сваіх просьбаў.

– Ты ня чуеш мяне? Зараз ідзеш са мною. Я не пытаюся, хочаш ці не. Табе нельга дадому. Альбо ты зноў гуза шукаеш?

Яна маўчала, адчуваючы, што зусім заблыталася й сама не разумее, чаго хоча. Янка меў рацыю: было страшна вяртацца дахаты. Аднак яшчэ страшней было сысьці адтуль назаўжды. Яна не магла імгненна прыняць такога рашэньня. Пайсьці зараз – гэта значыць выкінуць шэсьць гадоў маладога жыцьця проста на сьметнік свайго лёсу. Пайсьці зараз – гэта значыць пазьнішчаць усе спадзевы й мары апошняга часу. Страх тачыўся з усіх сітавінаў. Янка так і ня змог выпіць яго да дна.

Нібы апошні ўдар перад пакараньнем, чoвен тукнуўся аб бераг. Ён

[1] Герой старабеларускага рыцарскага раману пра Трышчана ды Ізоту; супраціўнік Трышчана, мужны й шляхетны рыцар, безнадзейна закаханы ў Ізоту. Пасьля чарговага двубою з Трышчанам Палямідаж памірае.

узьняў яе на рукі й панёс да сябе. Там паклаў на ложак, клапатліва падаткнуў пухкай коўдраю, мякка й спагадліва зазірнуў у вочы.

– Пасьпі крыху, адпачні, – сказаў ціха, правёўшы даланёю па галаве, лёгка пацалаваўшы лоб.

Сам зірнуў на гадзіньнік: “Я так стаміўся, а ягоны накрутак усё ніяк не сканчаецца, нібы хоча зрабіць выключэньне з правіла”...

## *V*

– Адась! – Янка са злосьцю высадзіў нагою дзьверы ў пакой, дзе адразу ж пабачыў сябра. Той нема сядзеў за сталом, ахапіўшы галаву рукамі. Ульлянчын заступнік схапіў яго загрудкі. – Ты, прыдурак! Ты што нарабіў? Га? – джвагнуў яго кулаком у пашчэнак. Упершыню, скрозь усё іхняе таварышаваньне.

Адась абыякава-пакутліва зірнуў на сябра, адно затуліўшыся рукамі.

– Што ты хаваешся, абэлтух? Што ты хаваешся? – выкрыкваў пагардліва. – Доўбень, ёлупень, ідыёт! Як ты мог? Яна адзіная чакала цябе – больш не чакаў ніхто! Яна адзіная верыла, што ты жывы – больш ня верыў ніхто! Яна амаль пасварылася са сваёю сям’ёю праз тое, што засталася жыць тут сама! Усе гэтыя гады была табе верная! Цябе толькі абагаўляла! Аб табе толькі дыхала! Табою адным пялегавала свае ўспаміны! І чым адплаціў ёй? – матляў яго ад сьцяны да сьцяны й трос так заўзята, нібы хацеў вытрусіць ягонае лядачае сэрца вонкі.

Адась ледзь трымаўся. Ён вінавата апусьціў галаву, захінаючы твар, нібы яму ганьба сьляпіцаю лезла ў вочы й зьбіралася зьдзерці з яго каменную маску, як скуру.

– Чаго дурня клеіш? Хочаш сказаць, што вар’ят, што шаленец, што хворы? Які ты хворы? Біць жанчыну ты – здаровы? А ґвалціць тую адзіную, якую кахаў, ты – здаровы? Ты паглядзі на сябе! Рукі-ногі цэлыя, галава на месцы! Які ты хворы? Ланцакаватым хочаш прыкінуцца? Ня выйдзе! Ты здаровы мужык, у цябе каханая жонка, у цябе цудоўныя дзеці! Што табе яшчэ трэба? – разьюшана пазіраў на яго ды крычаў амаль з нянавісьцю. – Відочна, я не перажыў таго, што давялося табе, – праз адну маці ў войска мяне не ўзялі, – то магу толькі здагадвацца. Але гэта ня ёсьць табе апраўданьнем і я не дазволю табе так зьдзекавацца з яе! Паслухай уважліва! Яна цяпер у мяне. У мяне ж пакуль і застанецца. Прынамсі, на пэўны час. Так будзе лепей. А потым – крый Божа, калі ты яе хоць пальцам кранеш – больш ты сваёй Ульлянкі не пабачыш. І тады мы з табою пагаворым іначай. Хоць ты мне й сябра, я прымушу Ульляну кінуць цябе, будзь пэўны. Падумай, што табе даражэй, – прамаўляў дужа катэгарычна.

Пры апошніх словах Адась толькі застагнаў і ціха аб’ехаў па сьцяне. Ягоныя вочы зрабіліся шклянымі.

– О, Божа! Толькі гэтага мне не хапала! – Янка адцягнуў яго на ложак. – Адась, ты мяне чуеш? – але той маўчаў і глядзеў скрозь яго. Гэта быў мёртвы погляд.

– Што з табой, Адасю? – ужо ўстрывожана мовіў сябра.

– Я – поскудзь, Янка, я – дрэнь, я – апошні гнюс. Праўду кажаш. Чаму ж ты ня зьбіў мяне на чорны яблык? Але й таго было б мала… – Адасевы

збалела-надламаныя словы гучэлі, нібы вырак. – Пра адно толькі малю – не забірай яе! Бо іначай… мне няма сэнсу… няма жыцьця.

Ля вушака паказалася Ульляна. Янку падалося, што глядзела на яго расчаравана-асуджальна. Але ў гэтым роспачным позірку зьбітае коткі выразна бачыў цень кволага шэпту пра паратунак.

– Я так і ведаў, што ты не стрываеш і прыбяжыш назад. Ён калі-небудзь прыб’е цябе за тваё выдыганьне, – злосна сплюнуў ды пайшоў, бразнуўшы клямкаю.

Ульляна ж, як сусьветная гармонія, рушыла да таго, каго кахала. Кахала, нягледзячы ні на што. Яна ўкленчыла перад ім, мякка абняўшы ягоныя калені і ўгрэўшы іх подыхам. Тады паклала на іх падбароддзе, зірнула ў ягоныя вочы – яна ўпершыню бачыла, як плача мужчына. Гэтая ціхая хваля, што вырывалася з берагоў ягоных вачэй, сьцякала па ейных шчаках неўтаймоўнаю плыньню раструшчаных пачуцьцяў.

– Ты ніколі мне не даруеш, – казаў ён пра мару свайго страчанага каханьня.

– І ты ніколі мне не даруеш, – казала яна пра толькі ёй вядомую здраду.

Доўга-доўга яны моўчкі глядзелі ў спакутаваныя вочы адно аднаго. Здавалася, што тады ў іх адбіўся неверагодны боль усяго сьвету, неператжыты боль усіх рэальных і нерэальных вымярэньняў, часоў і прасторы.

***VI***

Пахаваньне Янкі адбылося праз тры дні... Ён неасьцярожна ступіў на край чоўна й перакуліўся. Сутарга не дазволіла ўратавацца. Дый ці хацеў ён?

Ульляна павольна падышла да канапы, ціха апала долу чорнае адзеньне са стомленых плечаў... Паваліласяя, абняла падушку… коўдра заблыталася ў нагах. Перад вачыма мітусіліся выявы, нібы з нейкае стужкі. Аніводнае думкі. Проста шчыміць – і нават ня сэрца. Так баляча ў грудзях! Нібы там шайтан пацалаваў, пакінуў апёк, а цяпер хоча спавіць грудзі, каб захінуць прапаленую бездань. Шчыльна спавіў.

Яна нават не адчула, як вочы зноў панурыліся ў сьлёзы. Але нечаканасьцю гэта ўжо не было. Зараз зноў будзе плакаць, плачма плакаць, як і ўчора, і заўчора... ня здольваючы нават глытаць сьліну. Зноў заб’ецца нос і яна будзе задыхацца, хапаць, нібы рыбіна, паветра. І кожны надрыўны хліп узбагаціць яе й сусьвет, зьвяжа з Ім яшчэ мацней: шторазу, як ёй нясьцерпна баляча, яна адчувае вялікую, мяккую, цёплую далонь Бога на сваіх валасох… Адчуваючы Ягоную прысутнасьць і цяпло, як заўжды, яна неўпрыкмет засьне...

Прачнулася ўсё ад тае ж далоні. Адась гладзіў яе па галаве. Лагодна, пяшчотна, як калісь.

Тры дні яны маўчалі. Маўчалі й цяпер. Доўга маўчалі.

– І ўсё ж даруй мне, Ульлянка, – паціраў пальцамі скроні.

– І ты мне даруй, – баючыся сказаць лішніцы, яна была наважылася распачаць цяжкую для іх размову.

– *Ох, надзела Ульляніца лянок… і пайшла да суседа ў садок,* – раскрышаным голасам зацягнуў ён калісь улюбёную іхнюю песьню.

Ульляна здрыганулася. Запытальна-пужліва зірнула на мужа.

– Ведаю. Тады, калі мы плакалі, абавіўшыся, твае вочы былі люстрамі віны.

– І цябе тое не разьюшвае? Вось за гэта ты б мог мяне ўдарыць, – ейныя лоб і шчака яшчэ трымалі сьлед ягонай рукі.

– Вось за гэта ня мог бы. Сам вінаваты. Разумееш, я ня памятаю… ці кахаю цябе... Я ня памятаю, як трэба кахаць. Я ня памятаю, што такое каханьне. Каханьне па-людску.

Ульляна ўчапілася за сказанае, бо тое былі першыя ачалавечаныя словы, якія пачула ад яго па вяртаньні. Яна павярнула ягоны твар да сябе й цёпла пацалавала яму вочы.

– Ты ўзгадаеш, – мовіла як мага мякчэй. Ейнае неўтаймоўнае “ўзгадаеш, згадаеш, згадаеш” ціхім цалоўным рэхам зьлятала з вуснаў яму на вочы, нібыта хацела заплюшчыць, затуліць іх ад сваёй віны, нібыта хацела пераканаць іх у магчымасьці, у рэальнасьці ўспаміну. Але ягоныя калісь чароўныя азярыны былі цяпер недаверліва сьцюдзёныя. Адась прыняў ейныя далоні з твару ды адвярнуўся.

– Я не эгаіст, Ульлянка. Ніколі ім ня быў. Тое, што ты зрабіла – ня здрада. Здрада – калі перастаюць кахаць. А ты мяне кахаеш. Гэта адзінае, у чым я быў і буду ўпэўнены заўжды.

– Што ты хочаш сказаць?

Ён маўчаў. Упарта й нерашуча.

– Што ты хочаш гэтым сказаць? – настойліва паўтарыла яна.

– Калі запрагнеш, ты… можаш… можаш… кахацца… – прасякнуты гаркотаю, ягоны голас абарваўся, згубіўшыся ў прадоньні безвыходнасьці.

Ульляна аж падскочыла ў ложку. Па-ранейшаму ён сядзеў адвярнуўшыся.

– Ты што, зусім звар’яцеў? – ад подзіву й гневу аж дух заняло.

– Не, Ульлянка. Я ж чалавек не раўнівы ані. Відаць, ты пра гэта яшчэ ня ведала. Дзікая рэўнасьць – яна ж як нянавісьць. Іх не павінна існаваць, а яны існуюць. Ды ня толькі існуюць, а пануюць у нашым жыцьці. Ад іх усе забойствы, ад іх толькі – войны на сьвеце... ад іх... забойствы...

Ульляна адчула, што ён узьбіўся на сваё хворае месца. Паспрабавала трымацца, хоць абурэньне й крыўда віхорам кружлялі ў галаве. Але, зрэшты, цяпер яна была падобнае думкі пра здраду, чаго аніяк не сказала б пра сябе ранейшую. І праз зьдзіўленьне й боль ёй усё ж сталася адліжна, калі муж зразумеў яе.

– Ты ж ведаеш, што больш я такога аніколі не зраблю.

– Мне, пэўна, будзе боляча. Толькі не праз цябе – праз сябе. Праз тое, што не магу выкінуць мінулае з памяці. У здрадзе заўсёды больш вінаваты той, каму здраджваюць.

– У здрадзе абое вінаватыя нароўні… Адасю, ты больш ня зможаш запэцкаць мяне сваім забойствам: я сама забойца, – крутанулася на бок, падабраўшы ногі. Агідны ком ванітамі падкаціў пад самае горла, выціснуўшы з вачэй горка-салёную расу.

Адась азірнуўся. Нарэшце ён азірнуўся!

– Гэта ж я яго забіла. Я падумала пра ягоную сьмерць, і ён адчуў гэта. І я адчула, але не зразумела да канца. Ён жа сказаў: “Паеду да дзеда”. Сьледам за дзедам. Ён жа ня мае дзеда! А я ня ўцяміла, не зрабіла нічога. Нават не зайшла пасьля таго, як вы пасварыліся!

– А ён чакаў скрозь усю ноч.

– Што-о? – прыўзьнялася на локаць.

– Вось ягоны ліст, знайшоў зранку пад дзьвярыма.

Яна выхапіла з ягоных рук паперчыну, ліхаманкава разгарнула: *"Мая даражэнькая Ульцыся! Я ведаў, што ўсё падман, але ж спадзяваўся… Сонца ўзыходзіць так хараша, ды я не хачу ўплятаць новы вянок пакутаў і паміраю шчасьлівы… Ты, ясачка, ніколі ня думай, што было б, калі толькі б застаўся: кожнаму сваё. Я меў дарунак кахаць так, як іншаму не выпадае скрозь доўгае жыцьцё. Не дарма зьлятаюць зьнічкі ўвосень, у кожнага ёсьць зьнічка свая. Я зрабіў амаль усё, што хацеў – адно надрукуй мае вершы, я прысьвячаю іх маім ненароджаным дзецям… Не вінаваць сябе, гэта маё рашэньне. Пасьпець своечасова разьвітацца – таксама талент. Я ўдзячны табе, любая. Бывай.*

*Адась, памятаеш, як там у Палуяна: "Я так люблю жыцьцё й красу, ды не на маю долю выпала гэта". Ульлянка – твая краса, твая доля. Зрабі яе шчасьлівай за нас абодвух, дужа цябе прашу! Бывай, дружа".*

– Чаму ты не аддаў яго адразу? – вочы падмываў ціхі салёны ручай.

– Табе было б лягчэй? – запытаўся разгублена й абыякава.

– Я – забойца! – яна не хацела карыстацца сьмерцю Янкі, але толькі так можна было запэўніць мужа, што й на ёй ёсьць пэўны грэх. Толькі так можна было яго разгаварыць.

– Ульцыся, не дадавай сабе клопату. Янка – мой найлепшы сябра, і я вінаваты ня меней... Яго не каханьне загубіла, яго адсутнасьць красы ў нашым жыцьці згубіла. Ён вырас, лічы, хаваючыся пад ложкам мацілатругі. Пакуль яна жыла, даруй мне блюзьнерства, ён ня бачыў у хаце нічога прыгожага. Шукаў гэтага сярод аднагодкаў – не знайшоў. Праз ягонае дзівацтва – пачасту нават размаўляў вершамі – яго ніхто не разумеў! Толькі мы са Стасем маглі з ім сябраваць. Толькі нам давяраў свае першыя паэмы. Ён і ва ўнівэрсітэце, у групе быў такі ж, рахманы й замкнёны самотнік, надзвычай чульлівы. Адно дзяўчаты яму праходу не давалі – прыгажэнны хлопец! Ягонае гойсаньне па дзеўках – тое ж быў проста адзіны сродак абароны ад жорсткага сьвету. Але гэта ведалі толькі мы, сябры. Як не любілі яго за гэтае бабздырства! – прамаўляў падазрона спакойна й задуменна.

– Вось бачыш, а я адняла ў яго гэты апошні сродак і нічым не абараніла наўзаем! А ты кажаш – не забойца.

– Ульцыся, лекар жа сказаў – гэта сутарга. Нягледзячы на ягоную дурацкую цыдулку й дэпрэсіўны настрой, ён ніколі не зрабіў бы гэтага сам. Так, ён быў вельмі тонкай асобаю, але разам з тым – мужным чалавекам. Ён перажыў бы тое, што ты не прыйшла, хоць вельмі чакаў і, відочна ж, быў у роспачы. Ну паплаваў бы па возеры, астыў ды вярнуўся! Магчыма, ён проста хацеў зьвярнуць тваю ўвагу – гэта ж ужо не першыня. У студэнцтве ён колькі разоў пісаў такія цыдулкі дзяўчатам, якіх ня мог дасягнуць, – і тое спраўна дзейнічала.

– Сур'ёзна? Вы ніколі пра тое не казалі! Але гэта значыць, што ён усё ж наважыўся змагацца з табою, найлепшым сябрам. Уяві, усе гэтыя гады ён тут фактычна гаспадарыў, і раптам ты вярнуўся. Цябе ўжо ніхто не чакаў! Ён быў упэўнены, што рана-позна я пакахаю яго. А я была ўпэўненая, што ты прыйдзеш.

– Не, я ня веру, каб ён вырашыў спляжыць нашае сяброўства, хоць ён

і пагражаў гэтым. Хто заўгодна, толькі ня Янка. Мы заўжды давяралі адзін аднаму, як сваім вачам. Напэўна, ён скарыстаўся даўнім прыёмам неўзнарок. А можа быць, ён проста задумляў новы твор – на хвалях дэпрэсіі ён заўжды пісаў геніяльныя рэчы.

– Адасю, са сьмерцю ж не жартуюць!

– А ён жартаваў. За гэты час ты павінна была б зьведаць яго лепш, чымся мяне. Ён дражніў яе, дзёрзка пасьміхаючыся з ейных намаганьняў забраць яго ў палон адчаю, у нябыт. І яна пачула ягоны выклік… Людзі гінуць і без вайны...

– Гэта яшчэ больш страшна, Адасю.

– Відаць, – мякка прытуліў яе да сябе. – “Вось так гайдаў бы ўсё жыцьцё”. – Яны зноў доўга маўчалі.

“Гайдаў бы… Вось так… Толькі як прымусіць сябе цяпер? Гэты пах... Неадчэпны пах крыві... Вар’яцтва нейкае... Вар’яцтва!” – адштурхнуўшы яе, ён забегаў па пакоі. Гліняны гарлачык разьбіўся аб сьцяну. Раптам Адась выхапіў нож і пачаў з азьвярэньнем садзіць яго ў драўляны стол.

– Вуля, не чапай мяне покуль! – ён схапіўся за скроні. – Я ня ведаю, калі ўсё гэта скончыцца! Пах крыві. Калі ён пакіне маю сьвядомасьць? Я ня памятаю, як пахнуць валошкі й раса на сьвітанку! Ня памятаю, як пахне тваё каханьне! І ня ведаю, што зрабіць дзеля таго, каб прыгадаць тое! – у сьцяну ляцеў чарговы гарлачык. – Ня ведаю, што сказаць дзецям! Ня памятаю аніводнае калыханкі й аніводнага пяшчотнага слова! Яны ўсе вось тут, у скронях, пад засаўкай! Я адчуваю, як яны пульсуюць, як боляча б’юцца! Галава! Мая галава! Баліць... баліць... баліць...

Ульляна сьціскалася ад кожнага слова. Боязь заганяла твар у калені. Было такое адчуваньне, што гэтыя прыпадкі разьюшанасьці наганяюць яго зусім бяз дай прычыны й тады яму дзіка пачынае балець галава. Ці наадварот.

– Не глядзі на мяне такога! Чуеш? Не глядзі! Не глядзі! Даруй мне ўсё. Цяпер ты ўсё ведаеш. – Ягоныя вочы зноў зрабіліся каламутнымі, з шалёным бляскам. Яна хацела падняцца, але баялася. Боль ґвалту яшчэ варушыўся ў жываце, як зьнявечаны плод. – Не падыходзь! Толькі не падыходзь! Я сам... Я пайду... – стрымгалоў выскачыў за дзьверы. Задрыжэла шкло.

Гэта была іхняя першая размова па доўгачаканай сустрэчы. Сварка з Янкам ды ягоная раптоўная сьмерць разьвярэдзілі яму душу: клін кліна паганяе. Ён пачаў біць посуд, але не яе. Ён загаварыў з ёю. Ужо гэтаму была радая. Толькі куды ён цяпер? Куды?

Боль дапоўніўся новымі пачуцьцямі: боязь, трывога, шкадоба. Злосьці ўжо не было. Не было й каханьня. Ці гэта толькі здавалася? Мо яно сулезна, марна ўкарэнілася ў каньціках страху? Заступнік дзесь у нябёсах. А поруч – чысты вар’ят. “Яначак, ён загаварыў са мною. Ты нават па сьмерці дапамагаеш!”

Поруч – вар’яцтва. Яна ведала, што больш аніколі не заплача. Страх здушыў усе сьлёзы. Каханьне, боль, страх. Яна падышла да апошняе часткі трыяды, па-за якою перамагае штосьці адно.

Доўга й цяжка прабіраўся Адась па халоднай і брыдкай твані. Шаленства выкручвала мазґі... Боляча дыхаць. Нешта сьціскае грудзі й не дае ім уздымацца. Балючы хрып ірве нервы. Вось Вочы Ганулі. Што гэта за пах? Нейкі іншы. Духмяныя, блакітна-зялёныя травы. Зьнясілена правальваецца ў іх. Пах. З якім болем западае ён у скроні! З якім нахабствам галёкае: успомні мяне!!! Што зрабіў я з ёю? Яна была зусім іншаю, такая маленькая, гарэзьлівая. Я напужаў, я абразіў яе, ёлуп! Ёлупень!!! Што са мной? Хіба я не кахаю яе? Пэўна ж, кахаю. Інача́й ужо даўно б… засіліўся. Як дапякае нечая прысутнасьць. Як хочацца зрабіць ім боляча. Каб не круціліся тут, не таўпесіліся ўваччу. Янка, чаму Ён забраў цябе? Там сяброў рэзалі, тут – утапілі. Ну за што, Янка! Адзіны чалавек, якога я хацеў бы цяпер бачыць... Я ня буду рабіць яе нешчасьлівай... Я паспрабую... паспрабую.

...Дзівоснымі карункамі распаўзалася на паверхні лёгкая, малочна-смараґдавая ціна. Спляталася дрыготкай адамашкаю, выбухала россыпам бела-ружова-жоўтых гарлачыкаў. Вакенцы чорна-зялёнае вады цікавалі Бога. Трывалы дух багны, гарманічны жабін хор сярод адвечнае цішы, сонечная цеплыня. Суладдзе колераў, гукаў ды пахаў. Учора яны кахаліся ўпершыню. Яны ўпершыню кахалі. Нязьведанае, таямнічае. У летуценнай мілосьці соладка хіхікала душа. Ён суцішыў ейны боль за край буслоў ды багны. І пакахаў. Смактала дзесьці ў грудзёх. Пэўна, ад радасьці за сябе. З глузду зьбіла, закружляла ў ягласным карагодзе Пані Мілосьць. Хітраваты Цярэшка трапна пацэліў, і цяпер два сэрцы тахкаюць нібы Адно. Дзівосна-мядовае, раптоўнае, нечаканае адчуваньне: вось гэты незнаёмы чалавек, толькі ён адзін, патрэбны табе для шчасьця!

– Зірні, Адась, сунічка. Якая дробненькая, а так пахне, – пацалунак раскусіў яе надвая.

– Ты чуеш птушку? – загадкава пытаецца хлопец.

– Так.

– Паводле легенды, так высьвіствае Пяюн. Птушка каханьня. Хто пачуе, той кахаць будзе вечна.

– Распавядзі мне гэтую легенду! Хачу яе ведаць! – Ульляна ёмка ўладкоўваецца ля ягоных ног, як котка… Толькі яна ўмела так урастаць у яго…

– Кажуць, тут жылі калісь Трытон і Русалка. Пачуўшы Пеюна, закахаліся. Уначы іх бліскучая луска ападала манетамі і яны рабіліся людзьмі. Танчылі ў каханьні. Ён любіў ейны звонкі сьмех, валасы – колерам у жоўтую лотаць. Сузор'і дарылі ім сваю ўсьмешку й пяшчоту. А белы Месяц падарыў сына. Русявенькага, з блакітнымі вачыма. Ён купаўся ў расе калматае травіцы, піў белую расу з матчыных грудзей. За гэта яго й назвалі Беларосам.

– Ад яго й пайшліся беларусы? – няўрымсьліва перапытвае яна.

– Напэўна, так баяць старыя людзі, – хітравата кажа ён, бо толькі што панавыдумляў усё тое дзеля красаваньня перад любай дзяўчынай.

– Адасю, як прыгожа. Вось гэта зямля! У які куточак ні ступіш, дык усё легенда, усё паданьне, усё прыпавесьць якая. Беларусь мая, прыгожая мая, чароўная, чыстая, сьветлая, родная мая! З водарам суніцаў у дрыготкім сьвежым паветры! Адасю, ты адчуваеш яшчэ гэты пах? Такая зямля будзе жыць вечна. Сьпеўная, багатая! Ба-га-та-я-я-я-я-я!!! – звонкім рэхам адгукалася багна. – Госпаду, я слаўлю Цябе, стваральніка зямлі й

нябёсаў, мяне й маёй любові, гэткага духу суніцаў! Хораша! Мой бажок, як хораша! – яна скакала па невялічкай выспачцы, у шалёным танку закружваючы неба й Адася, захлынаючыся сьмехам ды шчасьцем.

Яны ведалі напэўна: ніколі ня згіне такая зямля, такая мова, мова іхняе мілосьці, бо яны з ёю – Адно. Ня згіне, покуль жыве гэты трывалы, сілмоцны сунічны дух, гэты салодкі смак на вуснах закаханых! Бальзамам змые ён увесь бруд, усю хлусьню, усю немарасьць з душаў чалавечых. Ён ачысьціць людскую сьвядомасьць да сьвятасьці немаўляці. І праз тое адраджэньне яны нутром пачуюць, што мова зямлі наскае – гэта й ёсьць наскае *alter ego,* без якога мы проста самнамбула…

Так роднае навакольле сьвяткавала іхнюю волю, іхнюю любасьць, іхняе каханьне. Нішто не магло зашкодзіць гэтай моцы, гэтай празе любові…

Такая была. Свавольніца й шаляніца. Цяпер яна так ня скача. Што зрабіў я з ёю? Што зрабіў? Адны вочы і плачуць, і сьмяюцца… Ад сьпёкі закіпаюць мазґі. Здалёк чуецца раздольле грымотаў. Гэта Ты, Госпаду? Сьляпы дождж. Пырснуў і няма. Паветра проста існуе, нават цявінак не залюляе. Гэта ж ня ўсё, Ты не пакінеш так? Вось хмары. Яны брудна-сінія. Віхор зьнячэўку. Лес стогне ў моцных абдымках ветру. Бліскавіца расьпілавала шызае неба жоўта-белай страліцаю. Моцны выбух... Стрэл? Выбух? Зноў, зноў, зноў, зноў... зноў ён... Шрапнэль у сьпіну. Макрэе ад крыві кашуля. Кроў... Сунічная кроў... Гэты пах... Такі пах... Пах... – яго званітавала.

Разьвіднела... Ульцiся! Вулечка! Ульлянка! Гэта толькі дождж, любая мая! Я памятаю, я кахаю цябе!!! Як добра цяпер, бо я ўспамінаю. Калісь цалаваў кожны твой пальчык, цалаваў тваё звонкае імя, называючы, як багіню – Леля, як кветачку – Лілейка: Л-е-ль-к-а! Лелечка! Ульлелька! А ты жартавала: Лілея Гарлачык… Цяпер ужо лепей, кветка мая. Лепей, бо я ўспамінаю.

Дробныя, халодныя кроплі ласкава хвошчуць твар танюткімі празрыстымі бізунчыкамі. Мокрыя травы пахнуць адмыслова! Гэты водар зусім іншы! Гэта Ты, Госпаду, адгукаешся з нябёсаў... грымотамі... маланкамі. Ты цяпер паўсюдна: у аксамітавай насычана-зялёнай траве, у шэрым асмужаным небе, у птушцы, якая, не баючыся, ляціць адна сярод грознага неба. Яна ведае, што гэта Ты!.. Які палёт, Янка, які палёт! Цяпер я разумею цябе, дружа. За такі палёт ня шкода й жыцьця... Гром – Твой чароўны голас! Ён карае і ўхваляе. Залева, змый гэтыя ўспаміны! Божа, дазволь ёй змыць іх... Я дзякую Табе! За суворасьць і ласку дзякую, за каханьне, хоць на душы страшэнная пакута. Ты даў яе – і я дзякую.

…Не, ён прыйдзе. Ён скажа яшчэ, што кахае. Ня можа не кахаць. Штодня мне бачыцца гэта ў ягоным паглядзе. Яшчэ будзе тое імгненьне... Але ж ён – вар’ят, чысты вар’ят. Ён хворы, і я… баюся яго і баюся… за яго... Як маланкі, як грому. Баюся і абагомліваю іх… Боязь і каханьне, злосьць і любоў, нянавісьць і пяшчота – якая хісткая мяжа... Хісткая.

Гарыць, моцна зьзяе паднебная зорачка. Яна, мабыць, адбіваецца цяпер у маіх вачох – з такой чысьцінёю ды ягласьцю ўзіраюся ў яе. Апантана выпростваю крылы й, здаецца, лячу, лячу туды, каб ухапіць яшчэ бранзалетаў з ладану. Аднак хтось бязьлітасна залыгвае мне рукі за сьпінаю – адольваю толькі пакутнае крананьне зоркі стамлёнымі вуснамі: як боляча!

– а яшчэ кажуць, што зоркі халодныя. Боляча, але ж цалую яе зноў ды зноў. Я сцалоўваю вусны ў кроў – яшчэ адзін слотны штрых зьялчэлае няґеґласьці – і адлятаю. Сэрца трымціць, душа й розум засталіся там. Я лунаю па-над жоўтымі вільготнымі разорамі: ужыгнаны копша носіць мяне, бяскрылую, у чорнай прасторы, ціхутка апускае ў зямлю, ахутаўшы плечы жытнёвымі валасамі. Божа праміль! Якімі даўгімі зрабіліся яны з таго часу, як адцяла іх тады, калі зорка растала зьнічкаю! Мусіць, яны вырастуць па пяты, пакуль недасяжная планета наважыцца зазьзяць дзеля мяне адной наноў…

Сёньня бачыла дзіўны сон. Богведама хто прамовіў з цямрэчы: "Скачы, будзь ранейшаю!". Адылі – толькі чорная прастора да самае раніцы… Ну як тут весяліцца, калі ня памятаеш, якая яна – усьмешка. Але ж... чаго тады чакаць ад Адася? І ён ня памятае, якая яна – пяшчота. А выключэньне з правіла такое нелагічнае.

## *VIII*

На стале ціха канае сьвечка. Адась глядзіць не міргаючы. "Вось зараз патухне – і я пайду да яе". Спачатку сьвечка здаецца малой яркай кветкай: сіні-сіні колер пяшчотна атуляе карычнева-шэры, у абдымках якога, нібы сэрцайка, затаемніўся сонечны цьвет. Вогненная кветка... Прыгожая, але ж вогненная. Агонь... Ай-ё-о!.. Скроні... Боль у скронях... Патрэсквае кнот – выбух... німб... Ромка, ты куды?!.. Позна... позна... енк... стрэл... яшчэ стрэл... порах... Порах? Гэта ж воск! Звычайны воск апёк пальцы! Страшэнны, непазбыўны ўспамін набягае хваляю. Вось... Зацьменьне сонца... сьвядомасьці... Зноў скроні. Ай-й-й! Кветка... Чароўнай... вогненнай... кветцы... грыб… выбуху!.. выбух!

…Прыгожае часта бывае жахлівым. Жахлівае часта стаецца прыгожым. Чаму нашыя страхі напачатку выглядаюць такімі прывабнымі? А тое, чаго выракаліся, урэшце, ратуе нас ад нябыту, ад праклёну, ад забыцьця? Навошта мы б'ем свае душы за тое, што ня вартае нашых пакутаў? І чаму не змагаемся за прывіднае шчасьце, за якім хаваецца сапраўдная Радасьць нашых лёсаў? Чаму мы так лёгка здаемся перад першымі ж дробнымі выпрабаваньнямі й перашкодамі? Дзеля чаго сварымся адно з адным, упікаем і абражаем на такой караценькай жыцьцёвай адлегласьці, нібы ў гэтым ёсьць нейкі звышсэнс, што дапаможа нам раскрыць ракавінку й падорыць жаданую перліну?! Калі надарыцца за жыцьцё адгадаць слушна, спазнаць гэтую артаграфію, у якой няма ніводнага правіла – ты шчасьлівец. Адвечная тайніца давяраецца абраным. Яе можа спасьцігнуць кожны, але ахвочых чамусьці так мала.

Жыцьцё падобнае да мовы, а людзі ў ім нагадваюць ейныя складнікі. Адныя – адыстар гукі: хтосьці – лагоднае, вытанчанае "Л", хтосьці – шорсткае, незгаворлівае "Р", хтосьці – пульхнае, салаўінае "С", хтосьці – шарае, зацьвярдзелае "Ч", хтосьці – глухое, няўцямнае "Г", хтосьці – звонкае, але прытоенае "Ґ". Другія – адыстар літары: адкрытае, шчырае "А" ці пакручастае, лукаватае "З". Трэція – ужо самі словы: зґрабныя й няґеґлыя, ціхмяныя й гамэрныя, салодкія й гаркавыя, цёплыя й зімныя, гладкія й цупкія; хтосьці з іх заўжды будзе пісацца з вялікае літары, а камусьці цэлую жытку наканавана з малое. Чацьвертыя – нібы гарманічная беларуская фраза, нібы шчасьце ў ажынах, нібы ясноты нябесныя. Пятыя –

як пяшчотная калыханка, як любая матчына песьня, як мілосная серэнада. І ўсе яны, быццам літары ў артаграфіі, жывуць па нейкіх уяўных правілах, з якіх існуе безьліч выключэньняў. Іх можа спасьцігнуць кожны, але ахвочых чамусьці так мала…

“Заўтра, я ўбачу яе заўтра!”... За ўсю ноч прысьніў толькі дотык. Адзіны дотык каханай далоні да лоба – і болю як быццам і не было зусім.

Туманную сьвядомасьць сну разрываюць крыкі на досьвітку. Зноў яны. Суседка Юдася свайго ґваздае. Маладую ён яе ґваздаў, а як занядужаў – яна пасьмялела. За нялюбага аддаў яе бацька. Цяпер яны ў вёсцы замест пеўняў. Шторанку дзед шукае прычыны, а старая моліцца, каб той яе знайшоў. Ранішняя прабежка. Ужо й біцца ня могуць – так, дзеля сьмеху. Тады пабуркочуць, а ўвечары, дык і ў дурня перакінуцца.

– Блінкі ж яму не даспадобы, асёл маляваны! Пахнуць яму чымсьці, старэцкая пуга! Сёлета з патэльні – пахнуць яму, гад печаны! А каб цябе качкі затапталі! Каб цябе ў чыстым полі дзьвярыма зашчэміла! Каб ты з таго сьвету казою хадзіў! – чыкільгала за старым Юдася з паленкам. І па сьпіне яго, па сьпіне.

Госпад літасьцівы! І не надакучыць усё. Паўстагоддзя. Дзень пры дні. Зьмянілася ўсё: краіна, грошы, хата, могілкі, дзеці, Вуля... Толькі ліха не мяняецца, заўжды яно моцнае, маладое, заўжды квітнее. Толькі нелюбоў не мяняецца. Крык ліха й шэпт дабра…

Чаму ня можа быць інačай? Вольнаму – воля, шалёнаму – поле, але і ў дзівацтве кожнага ёсьць драбінка ісьціны. Вернікі не сумняюцца ў чысьціні чалавека. Тады навошта ён чыніць ліха? Што першым было закладзена ў ягоную душу? Дабро ці ліха? І хто больш магутны: Бог ці д’ябал? Чаму мы гаворым: “Шануй Бога, але й тога, другога, не гняві”. Хто адкажа, калі гэта ўвогуле магчыма? А мо проста падкінуць манетку? Аднак чаму яна падае толькі адным бокам? Чаму менавіта так? Няўжо ўсё роўна, як упадзе? А мо сядзець, пацізкаць плячыма, пляваць тры разы праз небясьпечнае? Ці ж не праседзіш тады нечага важнага, ня ведаючы, навошта сядзеў, пацізкаў, пляваў... Вось і застаецца адно вучыць артаграфію бяз правілаў…

## IX

…Калісьці яна пыталася: “Цікава, ці кахалі мы ў мінулых жыцьцях і ці будзем кахаць у наступных?” – “Безумоўна, інакш не існавала б тады Адвечнага Каханьня”. Адчуваньне яе поруч з сабою, адчуваньне яе цяпла, позірку, пацалунку, клопату... Адно кола, адна моц... Так, гэта – дабро. Дык ідзі й кахай! Устаю. Іду. Толькі... як... што такое пяшчота... ня памятаю... і падаю... падаю... падаю. Ліха. Гэта – ліха. Ягоная праява... толькі ягоная…

…Калісьці шукаў, як тукоча ейнае сэрца пад пругкім грудком, вусны балелі ад няспыннага руху, душы заміралі ў кунезе... правал сьвядомасьці, памяці, існаваньня... Экстаз!.. Устаю... іду... але... але... падаю зноўку... зноўку... ды зноў…

…Калісьці ў адно імгненьне зрабілася цёмна. Моцны вецер разрываў прастору, гойдаў магутныя дрэвы, што танклявыя цыбалкі, зрываў і кружляў лістоту. Цёмна-шэрае неба скавытала звар'яцелым дажджом. А закаханыя на паляне, яны прагна цалуюць бязьлітасныя бізуны. Вось калі адчуваеш сябе нікчэмнасьцю й валадаром адразу! Воблачкі вільгаці пад хуткасьцю ветру, расьліннасьць стогне ад моцы разьюшанае прыроды. Кроплі з вуснаў ейных, кроплі з твару ейнага, кроплі з грудочкаў ейных, кроплі з жывата ейнага, кроплі з міжножжа ейнага... Экстаз! Пляваць на ўсё! Над намі вечнасьць пралівала сьлёзы, каханьне атуляла нас... Пах намоклае ігліцы й верасу, неба ў роўнядзі шэрага блакіту. Дзякую, Госпаду! Дзякую за дар каштоўны... Уздымаюся... іду... і падаю...

…Калісьці кугікала маладая сава адвечным лясным сумам. Так трывожна, нібы на пахаваньні. Гэта багна штодня хавала ў сабе жыцьці й сакрэты, крывавячы траву на купінах. Дурненькая сава, так было адвеку. Адвеку кроў хаваецца ў целы жывых істотаў і пры першым зручным моманце адтуль вырываецца... паціху й фантанам... фантанам, з асалодаю, акурат у твар каму-небудзь... Ты баялася крыку савы. Ты баялася будучыні. Ты баішся й цяпер... Ты крочыш за сьцяною й баішся зазірнуць, ты баішся... Я паказваў табе вясёлку, ледзь бачную ў вячэрнім паўзмроку. Гэта брама да Бога. Ты ведай, Ён не дазволіць табе плакаць... Але Ён дазволіў... Выходзіць, што так трэба... трэба... Устаю... іду... і падаю...

…Калісьці яна зачаравана глядзела на Купалу, што неяк раптоўна ўспыхнуў бела-жоўтым яскравым агнём. Пяшчотныя языкі аблізвалі ягонае стромкае цела. Дзе-нідзе аддавала чорным колерам, высока ўзьляталі срэбныя чароўныя бліскаўкі-стогны й шыза-чорны дым. Чорна-бліскучы комін уразаўся ў неба. Ніхто не сьпяваў, цябе гэта расчаравала. І толькі папараць з бліскучымі кветкамі расы вярнула былую гарэзьлівасьць. Карцела вусны сцалаваць да ран, каб духмяны мядовы сок цёк па целах. Ноч пяшчотнага цалунку й суцэльнае кунегі! Адны вочы – адзін позірк, адны вусны – адзін подых, адны рукі – адзін дотык... адно... адно... Устаю... іду... іду... іду... убачу яе зараз і ўпаду, але перад ёй... перад ёй на калені... Але на стале стаіць толькі вячэра, прыкрытая ручніком... і падаю... зноўку падаю... падаю... зноў ды зноў...

### X

Жнівень. Халодныя зорныя ночы. Зьнічкі лятуць, нібы маленькія каметы. Ляжыш на капе сена й цікуеш на чорным покрыве неба зорку. Мігціць, усьміхаецца. Раптам блісьне танюткай істужачкай ды згасьне ў вышыні нябёсаў. Веліч Птушынага Шляху заварожвае. Прасьвяда! Адчуваеш еднасьць – галава кружыцца ад шчасьця. Божа, хто й калі зможа растлумачыць гэткае шчасьце, гэткую любоў? Хіба толькі Ты Сам? Але як мы пачуем Цябе? А мо Ты ўжо даўно тлумачыш? Зьнічкаю, месяцам, водарам, дажджом, вясёлкай, каханьнем? Толькі мы не разумеем такога перакладу... не разумеем, бо не заўважаем. Няма часу проста выйсьці ў поле, легчы на салому й глядзець у бездань блакітную альбо чорна-белую. Проста глядзець... гадзіну, дзьве, тры... Проста наталяцца... Проста сузіраць... Нам шкада на гэта часу.

…А яны тады глядзелі. І цалавалі, і барукаліся, і кахалі. Тое шчаснае адчуваньне, калі гармонія рухаў яднае экстаз з малітваю й разварушвае паветра, – не раўнуючы навальніца. Праз магутны выбух мілосьці, з кожнай хваляю пяшчоты яны рабіліся больш дужымі, узбагачаючы сябе й сусьвет. Адась казытаў каласком ейныя набрынялыя грудочкі, жывот, сьцёгны. Як ліхаманкава, як прыгожа ўздрыгвала ёй цела, з прагнасьцю ловячы кожны дотык, кожнае шчаснае бізаваньне сваіх зґрабных палавінак! Ейныя даўгія мяккія валасы, як прыліў, атулялі яго – адно іхняе крананьне ўкідала Адася ў бездань грымотаў. Яна любіла хваляваць ягоную сутнасьць вадаспадам ільняных валасоў. А ён, абмываючы іх, наталяючы цёплым малаком жыцьця, мілосна клікаў яе Ульлянкай-Ільнянкаю. Агонія пачуцьцяў стагнала крыкам птушкі пры часе кананьня…

На даляглядзе бліснула сьвятло. У паветры лунала ранішняя прахалода. Раса на стрыжаным полі зьзяла ў промнях маладога сонца дробным адамантам. Ульлянка прачнулася ад холаду.

– Ня сьпіш? – ён заўжды спаў вельмі чуйна.

– Не, зьмерзла. Калі ты зараз жа не закідаеш мяне сенам, табе прыйдзецца абдымаць мой асклелы трупік.

– Во! А я толькі думаў натхніцца тваімі прыгожымі формамі. Можа б санет які напісаў, як Янка.

– Слухай, ты, морж азёрны! Думаеш, калі купаешся ўзімку ў палонцы, дык усе такія? – жартам душыла яго.

– Любачка мая, маржы ў нашых азёрах не жывуць! – ад душы рагатаў той.

– Зьмей! Ты яшчэ й зьдзекуешся? – гарэзьліва шчыкала яго за бакі.

– Дык морж ці зьмей? – усё шкеліў з яе сьмяшліва-дзіцячае разьюшанасьці.

– Горай! Ты – іх мяшанец, ты – цмок!

– О-о-о! Ласкавая, мая ласкавая! – як каток, натхнёна курняўкаў ад велізарнага задавальненьня.

– Ну ж цмок! Чысты цмок! – неўтаймоўна-адчайна выгукала свае першыя кампліменты дзяўчына.

– Сонца, ты – дзіва! Маё маленькае каштоўнае дзіва, Ульлянка-каханка, – пялегаваў ейны слых хлапец.

Адылі пахаваў сваю ясачку ў сене, затуліўшы сабою, як коўдраю. Ягоныя мяккія рукі вывучалі яе, нібы пэндзаль мастака. Прахалодны досьвітак крозна ўгрэўся пад покрывам мілосьці…

– Адась, а калі я зраблюся цяжарная? – ужо сур’ёзна пыталася гэтае нядаўняе чарцянё, прагна глытаючы пацалункі.

– Нават калі ты й ня зробішся цяжарная, хіба адмовішся са мною шлюб шлюбаваці? – шалёна-ласкавым прадоньнем зазірнуў у ейныя пекныя вочы.

– Ты сур’ёзна?

– Анягож?

Яна доўга маўчала. Ён не чапаў. Нарэшце няўрымсьліва выдала: “Згода!” – і кінулася вырывацца, ня вельмі таго жадаючы. Дый уцякаць не было куды… Яна не памылілася. Гэта была цяжарнасьць...

Вясельле гралі напачатку верасьня. Жылі ў дзядзькі Сержука ў Менс-

ку. Адасеў дзядзька быў адналюбам: па сьмерці нявесты ён так і застаўся бабылём.

Надвор'е было адмысловае: пярэкрут. Пяшчотныя промні-мастакі фарбавалі ўсё навакольле ў залацісты колер. У паветры кружляла барвова-жоўтая, з рэшткамі зялёнага, лістота. Адміраючы, падала да ног закаханых. Ціхі вятрыска зрываў яе з бацькоўскіх галінак і ўсё нёс, нёс кудысьці далёка. Яна шкадавала гэтае лісьце: як не хацела яно разьвітвацца з тым прыстанкам, дзе было так утульна й цёпла! Яно чаплялася за кожную галінку, за кожны цыпель, нібы яшчэ спадзявалася прырасьці, застацца ў родным месцы. Яно баялася будучыні. І Ульляна баялася. Баялася непрытомнасьці, ванітаў шторанку, спароду. Тым часам яна па-дзіцячаму зайздросьціла лёгкаму, як ёй здавалася, мужчынскаму лёсу. Злавалася, як малое, хоць часьцей старалася быць спакойнай, атуляючы свой плод любоўю. Аднак, калі ва Ульляны вырасталі рожкі – іх цяжка было падпілаваць.

– Ульціся, я ж ня Зеўс, каб вынасіць ды нарадзіць за цябе! Я ж дужа-дужа цябе кахаю й таксама хвалююся.

– Хваляваца й я ўмею! – яна сердавала, па-акторску пахліпваючы.

– Ведаеш, мой дзед неяк баяў, што Богу душу ледзь не аддаў, пакуль бабця нарадзіла – далібог! – спрабаваў апраўдацца Адась.

– Ты ж у войску будзеш! – не сунімалася Ульлянка. Канчаткова яе супакоіў першы штуршок дзіцяці й разгублены неспакой мужа.

– Адасю, яно штурхаецца!

– Што штурхаецца? – прыбег з залы, пераляканы.

– Што-што? Малое! – усклала ягоную руку на жываток.

– Нішто сабе! Нібы там войска, а не малое. І... табе не баліць? – ня даў веры ён.

– Во дурненькі... – шчыра расьсьмяялася.

– Ведаеш, толькі за гэта вас, жанок, варта абагаўляць: каб у мяне там нешта длубалася ў жываце, хай бы і ўласнае дзіцё – б-р-р!

– Ат, дурань які дурненькі!.. – яе душылі сьлёзы сьмеху. Яна не магла спыніцца. Гэта была акурат тая сітуацыя, калі ейны мужны Адасік умэнт рабіўся наіўна-сентыментальным. А яна сталела з кожным штуршком дзіцяці. Яны мяняліся ролямі.

Так хутка праляцела бурштынавая восень. Адась насіў яе на руках. Толькі на пачатку сьнежня неба захлімкала тонкай імжою, разгарнуўшыся скрозь шэра-брудным дываном. Аголеныя дрэвы з жалем паглядалі на лістоту, што зрасталася з зямлёю. Сьнегу яшчэ не было, але штораніцы азызлую, рудавата-чорную траву пад вокнамі ахутвала цнатліва-белая шэрань. Удзень, калі хмары-ліхадзейкі выпускалі на колькі гадзінаў сонца, яна зьнікала, але раніцою зноўаднаўлялася, забіраючы ўсё больш ды больш прасторы. Вось яна зьявілася й на шкле танюткімі чароўнымі карункамі. Хто калі разгадае іхнюю філасофію? А філасофію каханьня, шлюбу, цяжарнасьці? Аніхто. Аніколі. Шмат сказана й шмат яшчэ скажуць. Але неспасьцігальныя таямніцы Бога, як і Ён Сам – застануцца загадкаю...

Ён цалаваў ейны жывот. Так пяшчотна й ашчадна, з любасьцю і ўтрапеньнем. І гэта было шчасьцем. Маленькі прасьвядны камячок незнарок штурхане ножкаю, дробненькай ручачкай, ляжа ямчэй. Цікава, як яму зараз? Ці ўтульна? Ульляна выношвала, як сьвятая. Баялася рэзкіх рухаў – раптам яму не спадабаецца? І з першага дня размаўляла з ім, размаўляла бяс-

конца. Адась насіў іх на руках. Па сонных прысадах, па стуманелым гарадскім жыцьці...

Цяпер жа яна даглядала яго, як дзіцё: нейкім дзівам ледзь прымушала паесьці, купала ў ваньне, за руку выцягвала з хаты на сонца ды бясконца лашчыла й лашчыла. У горле схлупіла ад крыўды й болю, але яна лашчыла. Яна проста выпраменьвала нейкую дзівосную дабрыню й мяккасьць, бо была адораная гэтым талентам напоўніцу – нават звыш зямное чалавечае меры. Кахала Адася звыш зямное чалавечае меры… І за лета яна ўсё ж выхадзіла яго.

Яны працавалі разам у адным менскім ліцэі. Аднак яшчэ й цяпер яна часам не разумела яго. Удзень ён хадзіў на працу й быў звычайным чалавекам: віртуозна выкладаў літаратуру й аніхто з калегаў падумаць ня мог бы, што ў чалавека на сэрцы; але, як толькі пераступаў парог іхняга жытла, ці то надоўга сьціхаў, ці то шалеў – упярэмешку. Аднаго разу, паклаўшыся спаць, ён зірнуў сабе пад коўдру й сказаў: “Жыцьцё маё, прывітаньне! Агу! Ты дзе?” – і пайшоў шукаць яго па кватэры, хаваючыся ад перапужанае Ульляны ў шафы ды пад ложак!

Былі размовы, справы – толькі звычайныя, будзённыя. Ён нават мог насіць яе на руках. Іх на руках, бо Ульляна зноў выношвала дзіцё. Выношвала, як сьвятая. Толькі ня ведала: дзіцё ґвалту альбо дзіцё здрады... Ён насіў іх на руках, гэтаксама, як калісь, слухаў ейны жывот – толькі ж не кахаў! Почасту яна чула, як зьляталі долу рэчы, як біўся посуд… Без Адася яна жыла, верыла, кахала. Чакала й плакала. Баялася й плакала. А цяпер? Што цяпер? Пустэча й самотнае нічога. Ён поруч і разам з тым так далёка, нібыта мара, нібыта здань у той самай пустэчы. Сам, як пустэча. Дрыготкая, гарачая, шуплая… Пустэльня расьце. Гора таму, хто тоіць у сабе пустэльню… дзесьці яна такое ўжо чытала… Сон пры сьне – безгаловая жоўла, метафара спляжанае моцы й суцярплівасьці. Не засталося нават сьлёз. Рэдкія кроплі былі зусім бяз смаку, бяз солі, без жыцьця. І нават у гэтых ссохлых, засьмяглых кроплях не было аніякае рахубы: яна разумела – таго, што было, таго Адася – павек ня выплакаць у Бога.

## *XI*

Быў канец студзеня. Сьнег намёў вялікія гурбы, заляпіў усё, куды толькі змог патрапіць. Усё навакольле было бялюткае: зямля ўвабралася сьнежным дываном, дрэвы апранулі зімовы саван, таўшчэзны дыямент лёду сьцяў Сьвіслач. Моцны рэзкі вецер скавытаў за вокнамі, уздымаючы аблокі сьнежнага пылу.

Ульляна падышла да вакна, узьняла вочы да неба. Яна зьдзівілася й жахнулася: чаму раней ніколі не назірала за начным небам узімку? Было надзвычай прыгожа, але чамусьці і страшна: на чорным улоньні хутка плылі сьветла-шэрыя хмары, якія проста шкамутаў на часткі няўрымсьлівы вецер. Ён страшэнна скуголіў, паганяючы шматкі аблачынак па нябесным шляху, а тыя ўсё плылі й плылі кудысьці далёка, затуляючы сабою яркую поўню. Чаму б ім ня скласьціся ў словы, каб прачытаў іх каханы? Яна марыла пра гэта, як і тады, калі чакала Адася. Ён быў далёка. Ён і цяпер далёка. І яна зноў прасіла ў хмараў заступніцтва… Але пачэзлай

зьнявечанай памяці зацята назаляла толькі калісь упадабаная цярэшка, сэнсу якое раней не адчувала.

Цярэшка, Дасюль, Дасюль!
Дзе ж ты быў дасюль, дасюль?
На тое забыліся,
Як змалку любіліся!

Яна доўга глядзела на пашарпанае неба ды ўсё думала, думала. Думкам не было канца, як таму хмарнаму шляху. Разам з разьюшаным ветрам шпарка ляцелі й па-вар'яцку біліся ў шыбу дробныя белыя сьняжынкі. Ульляна прыгадала, як зранку глядзелася ў люстэрка: заўважыла першую зморшчынку-карпачык на лобе, вочы былі такія ж прыгожыя, хіба толькі крыху пабляклі. Затое яны зрабіліся нейкімі больш выразнымі, ёй нават здавалася – папрыгажэлі ад сьлёз. Нягледзячы ні на што, яна ніколі не забывалася на свой выгляд. Яна надзвычай старалася выдавацца шчасьліваю...

Неўтаймоўна даўгая кудаса сьціхла. Ульляна зноў зірнула на неба. Там было ціха-ціха й спакойна, як у вечным сьне. Там не было аніводнае хмурынкі, там было сьветла. Толькі барвовае адценьне палохала, як глухі стогн, незразумела чый: ейны ці Адасеў. Яна даўно пераблытала іхнія лёсы. Цяжар на сэрцы й цяжар пад сэрцам.

Яна гладзіла свой жывот, як раптам адчула цёплую моцную далонь на сваёй руцэ. Гэта Адась абняў, ласкава прыгарнуў да сябе. Досыць моцна, нібы хочучы захінуць на ўсё астатняе жыцьцё пры разьвітаньні. Пацалаваў у шыю, яна пачувала ягоны гарачы подых на патыліцы. Гэты подых саграваў усю сутнасьць. Яны проста стаялі й маўчалі, гайдаючыся ў хвалях сакральнае начное цішыні. Нейкі невядомы лёс, невядомы боль не пускалі іх у чаканае Адно. Ён ведаў, што яна грае шчасьце. Ведаў, што кахае й пакутуе. Ведаў, што дома заўжды будзе чакаць яго вячэра, з любоўю зробленая ейнымі рукамі, ейны ўтульны абдымак, ейны цёплы цалунак. Яна, напэўна, хутка схавае сьлязу перад самым ягоным прыходам, нацягне ўсьмешку й ані слова дакору, ані разу. Ведаў, што кахае, але нічога ня мог зрабіць з сабою. Змагаўся, ды ня мог... Ня мог запэцкаць ейнае сьвятасьці...

...Адылі была вясна, сапраўдная вясна. Было каханьне, была любоў, было жыцьцё. Толькі Адась і Ульляна адчувалі іх паасобку. Сілы прыроды абуджаюцца, каб пакахаць гэты сьвет і нарадзіць дзеля яго. Штогод зялёныя кволыя парасткі прабіваюцца ад самога Вялеса ў надзеі, што нешта зьмянілася на зямлі за іхнюю адсутнасьць. Але, не пабачыўшы нічога сьветлага, пачынаюць ствараць гэта самі: танклявая кволая зеляніна, стракаты ад пралесак гай, птушыны гоман, балбатлівыя ручаіны. Так зямля робіцца блакітна-зялёнай. Сонца прыпякае мацней, уся квецень аддаецца яму бяз рэшты. Так зямля робіцца бела-блакітнай і жоўта-чырвонай. Блаславёны подых гліцы, вясьнянага ветру жыцьця – і ўсё робіцца такім, якім павінна быць адвеку. Трэба толькі зірнуць на гэткую прыгажосьць, толькі дыхнуць напоўніцу – і прырода сама адкрые ўсе свае тайніцы. Самае важнае… не пераступіць цераз гэтае хараство, заўважыць яго – бо яно ж проста крычыць да цябе: заўваж!!! паглядзі на мяне!!! – і тады ўцяміш, што толькі дзеля такога акрыяльнага пачуцьця разуменьня, радасьці й шчасьця варта жыць.

Але ж двое закаханых адчувалі гэтае хараство паасобку. А першага

красавіка, у саменькі Дамавік, як іронія лёсу, як іронія вясны, нарадзілася чарнявенькая Марыська. Крыху пазьней, а сярэдзіне лета ў Менску выйшла пасьмяротная кніга паэзіі за прысьвячэньнем: “Доні маёй…” Праўду тутэйшыя людзі кажуць: “Сьмерць бярэ й вывад дае”.

## *XII*

Гэтае веснавое нараджэньне сталася сапраўдным адраджэньнем. Адась ніколі ня думаў, што чужое жончына дзіцё зможа выклікаць усю ягоную пяшчоту, абудзіць усю ягоную любоў, падарыць столькі радасьці. Толькі адзін раз, калі ўзяў чарнявенькае немаўлятка на рукі, падумаў пра іхнюю здраду. Толькі раз падумаў, што ня роднае. Зрэшты, Янка ж расьціў ягоных дзяцей. Цяпер Марыська – ягоны абавязак. Марыська – ягоная віна, ягоны боль, ягоная здрада, ягоная памылка й ягонае дзіцё. Толькі ягонае. Роднае-раднюткае. Раднейшага не бывае.

Ён сядзеў у дзяцёўні, дзе спала трое ягоных малых. Блізьняты ціхенька пасопвалі, заблытаўшыся ў коўдры. Было відаць, барукаліся перад сном за прастору. Яны заўжды так засыналі. Усе спробы Ульляны пакласьці іх паасобку нічым ня скончваліся: малыя ўсё рабілі разам, як спрэжаныя. Яны былі падобныя, што дзьве бубачкі, хіба толькі валасы Гіленка мела крыху даўжэйшыя за Данікавы. Ульляна шмат апавядала пра іх. Як былі меншанькія, казала, мяняліся талеркамі за сталом: сваё ня смачнае, а браток ці сястрычка, маўляў, благога ж ня дасьць. Ён гуляўся з імі. Па-сапраўднаму. Ён шмат чаму навучыўся за гэтыя месяцы, шмат усьвядоміў: толькі з імі ён ня можа сабе дазволіць сваіх успамінаў. Адна іхняя прысутнасьць у кватэры стрымлівала ягоную разьюшанасьць. Ён глядзеў на іх з усьмешкаю, як толькі й мажліва глядзець на дзяцей. Гэтае льняна-валошкавае дзяцінства, сьмяшлівае й празрыстае, супакойвала яго так, як толькі ейная цёплая скроня ля ягонай гарачай. Але жончына цярплівасьць часам і злавала: ён ад усіх чакаў злосьці й нелюбові, увесь час быў гатовы абараняцца – тройчы клятая вайсковая звычка. Ён чакаў ейнага дакору, ейнае сваркі, ейных абвінавачаньняў, але ня мог дачакацца. Быў удзячны за тое, хоць не заўжды разумеў, адкуль жа ў ёй столькі сонца… І казаў пра гэта рэдка. Калі б толькі яна не стрывала – усё, сталася б ворагам, як тыя, што крычалі й білі. Сам крычаўшы, ён не сьцярпеў бы крыку каханай. Ён яшчэ чуў яго з тае ночы й ня мог дараваць сабе. Ён упарта не хацеў успамінаць, адкуль тое сонца, якім была колісь ягоная душа, што яна цалавала, адгарнуўшы каўнер вышыванкі; аднак ён ведаў, адкуль гэтая цярплівасьць: Ульляна спагналася на іхнім прыяцелю, наталіўшыся чужою пяшчотаю. Магчыма, тое была цьмяная, падсьвядомая рэўнасьць… А Марыська – вось яна, маленькі чарнявенькі напамін, ягоная віна перад жонкай ды сябрам. Адась ніколі ня мог бы й падумаць, што гэтае дзіцё ён будзе абагомліваць да самазабыцьця. Ён кешкаўся з ёю болей ад усіх, нібы яна была ягоным апошнім шанцам. Шанцам да свабоды. Свабоды ад успамінаў, свабоды ад агрэсіі, свабоды ад граху. Нібыта яна была ягоным выкупленьнем, ягоным вырваным сэрцам...

Марыська расплюшчыла свае вочкі-вішанькі, пабачыла тату й заўсьміхалася. Яму нават падалося – хітравата, быццам яна ведала й разумела больш, чымся чалавеку было дадзена. Падалося, нібы вачыма

немаўляці зазірае ў сьвет Бог, бо ў гэткім позірку насампраўдзе ёсьць штосьці ўзвышанае, штосьці нябеснае. Марысьчыны вачаняты – адвечная магія чысьціні й любасьці – зачароўвалі ды лекавалі, нібы сам Янка глядзеў на яго й казаў: “Жыві!” Ён і клікаў яе Яначкай, так, дзеля сябе, нібыта шукаючы ў ёй страчанага сябра. Сваёю цнотаю й гарэзьлівасьцю малая вельмі нагадвала яму ранейшую Ульлянку…

Сёньня жоначка апавяла яму свой чарговы дзіўны сон: з адцятае галавы старое лядачае жоўлы вырастала маладзенькае й спрытнае, сьветлае колерам жаўлянё.

## XIII

Адылі – было лета, пясчанае пыльнае лета, другое пасьля доўгага расстаньня. Чакаючы халоднае неспагады, Адась адчуваў выпраменьваньне любові, пяшчоты й клопату, што ўсё ж скаланулі імклівы шарош на ягоным параненым сэрцы. Паступова ён спасьцігаў шэрае неба й нарэшце ўпадабаў яго. Яно не найлепшае, што ёсьць у жыцьці, але й яно – жыцьцё. Ён пачынаў усьведамляць, што выжыў тады й адраджаецца цяпер. Пачынаў разумець, як прыемна быць жывым і наколькі ён зямны чалавек. Яму падабалася проста быць жывым! Пачуваў, як прыемна дыхаць, як прыемна есьці прыгатаваную ёю ежу, наколькі прыемнай можа быць існасьць ува ўсіх члонках.

…Госпаду, гэта Ты! Ты даў мне гэты дарунак – жыцьцё, і я дзякую Табе. Я жывы! Жы-вы! Вось ён – сьвет вакол мяне! Ён цудоўны, чароўны, бо мае вочы робяць яго такім, мая любоў. Вось яно – каханьне! Яно бязьмежнае, бо гэта ж я… бачу яго такім. А я – чалавек. Я – добры чалавек. Я – не забойца. Я – стварэньне Тваё, Госпаду. Яно ня можа быць ліхім. Так-так, я – добры! А куды б ні трапіў добры чалавек – там, кажуць, нябёсы?! Так, там рыхтык нябёсы. Кожны чалавек – гэта анёл з нябёсаў, ці ня так? Толькі ня кожны слушна ўсьведамляе сваю сьвятасьць, абмінае яе, не заўважае й гэтак пляжыць. Кожны чалавек – сьвятасьць Божая, Ягоная ласка й любоў.

І Ульлянка – любоў. Мая любоў і маё каханьне. Мая слодыч і гаркота. Мой боль і сьмех. Маё цела й мая душа. Мой грэх і маё выкупленьне. І я кахаю яе. Кахаю. І цяпер я ўстану, пайду да яе й не ўпаду. Вось першы крок, вось другі. Яны яшчэ кволыя й адыстар нагадваюць Марысьчыны, калі яе падтрымліваюць за ручкі, але я іду. Вось трэці крок. Але што гэта? Гарлачык? Так, ружовая лілея пад нагамі. А там – жоўтая, там – белая. Як прыемна казычуць яны мой крок, мой нясьмелы наступны крок. Я йду па вадзе! Зараз я назьбіраю табе, каханая, цэлы пук гарлачыкаў, выслаўшы імі паўберагу. Ты калісьці сказала, што за шыкоўны букет даруеш усё, і цяперака – лаўлю цябе на слове. Магчыма, ты не адразу паверыш у гэты сон стракатых лілеяў ды водар маёй шчырасьці. Але я пераканаю цябе, любая, я адолею самы важны крок. Вось ён, утульны кубялок наскае мілосьці: менавіта тут народзіцца нашае дараваньне, нашае наступнае дзіцё. Зараз я апошні раз зірну на пярэстае пульхнае кубла з вады, што так доўга залівала мне вочы й не пускала на паверхню, сарву апошні, кара-

леўскі гарлачык – хай будзе табе падушачкай – і пайду да цябе на твой бераг, на наш бераг. Я буду ісьці, покуль ня ўбачу цябе, мая адзіная, мая жаданая. І ападу толькі ў твае любыя абдымкі. Я дайду, бо Я КАХАЮ ЦЯБЕ…

Адвечным ранкам з-за хмар пазірала хваравітае сонца. Яно адчайна крычала да хрыпкі ўвушшу пра сваю прагу мілосьці, якую хціва спавілі нябесныя ліхадзейкі. Яны хацелі пакінуць сонца толькі сабе, дзесь далёка, дзесьці за сёмым небам – там, адкуль не прабіваецца незямное шчасьце, там, дзе пачынаецца пекла й змрок. І зямля ня ведала, ці здолее сонца, што абяцала сьвяціць толькі ёй, прарвацца скрозь ейную крыўду і ўгрэць-залагодзіць яе сваім ядвабным цяплом… Але асмужанае неба, якое таксама злавалася на хмары, ужо ткала свае нябесныя красёнцы, нацягваючы іх да зямлі срэбна-гулкім павуціньнем. Пад сонечным зьзяньнем яно павінна было задрыжаць чароўнай мелодыяй танкаструнных гарфаў, якія калісь гралі зямлі вальс нябеснае пекнаты… Зямля затоена чакала пяшчоты квецені, што адродзіць сонечнае праменьне на росных струнах. Уваскросіць і залюляе на крышталёвых хвалях сваёй мілосьці. Уваскросіць, насуперак усім правілам жорсткае артаграфіі. Уваскросіць, бо іначай – няма сэнсу, няма жыцьця.